ЯК ПЕРААДОЛЕЦЬ «НЕПРЫГОЖЫ» ДЫЯГНАЗ?

Сямейная кватэра

КІНУЛА БІЗНЕС ДЗЕЛЯ МАРЫ МУЖА 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ЛІПЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 131 (28747)

ЛІЧБА ДНЯ

На 21,9 %

павялічыла Беларусь у студзені — маі 2018 года экспарт тавараў і паслуг у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года — да $16,7 млрд. Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг склаў ў суме $33,1 млрд, што на 22,3 % больш, чым у студзені — маі 2017 года. Знешнегандлёвы абарот тавараў вырас на 22,7 % да $27,7 млрд, пры гэтым экспарт тавараў павялічыўся на 22 % да $13,3 млрд. Знешнегандлёвы абарот паслуг адзначаны на ўзроўні $5,374 млрд (120,4 % да студзеня — мая 2017 года).

ЁСЦЬ РЫНАК — ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ

Аршанскі авіярамонтны завод стаў дзяржаўным

Адпаведную заяву ўчора зрабіў Аляксандр ЛУКАШЭНКА, наведваючы дадзенае прадпрыемства.

СТАР. 2

Фота БелТА.

НА ЯГАДНЫМ ПРЫВАЛЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шматдзетная маці пяцярых дзяцей Ірына ЦЯСЛЮК з Мінска (на фота ў цэнтры) са сваёй сястрой Святланай, сынам Іванам і ўнукам Валянцінам адпачываюць у час збірання чарніц і малін у лесе каля вёскі Чарнавокі Верхнядзвінскага раёна. Кожнае лета Ірына Васілеўна прыязджае ў вёску да сястры, якая ўжо дзесяць гадоў жыве ў гэтым запаведным кутку. У ягадны сезон жанчыны прыносяць з лесу па дзесяць-дванаццаць кіло спелых сакавітых ягад у дзень. Ягаднікаў заўсёды суправаджае і чатырохногая памочніца Джэсіка.

КАРАТКА

Трэці працоўны семестр на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі стартаваў 11 ліпеня. Працу зводнага беларуска-расійскага студзенцкага атрада Саюзнай дзяржавы, у складзе якога будуць шчыраваць больш за 350 чалавек, плануецца арганізаваць на Беларускай АЭС па 24 жніўня ўключна.

Ва ўсіх рэгіёнах Беларусі з лютага зарэгістравана 178 выпадкаў адру. У асноўным гэта завозныя выпадкі. Большасць завозаў звязана са знаходжаннем ва Украіне.

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі заклікае да прыняцця цэнтралізаваных рашэнняў аб зніжэнні платы за інтэрнат для некаторых катэгорый грамадзян або прымяненні адраснай матэрыяльнай дапамогі.

Білеты на II Еўрапейскія гульні паступяць у продаж з 1 снежня. Іх можна будзе набыць на спецыяльным сайце minsk2019.ticketpro.by, а з 1 сакавіка білеты на гульні змогуць набыць праз сайт усе ахвотныя з любой краіны свету.

■ Навуковы падыход

ЗАМАРОЖАНЫ КАЎЧЭГ

Пра што раскажа ДНК?

Калі ў мінулым стагоддзі шмат адкрыццяў было зроблена ў галінах фізікі і біялогіі, то XXI назавуць стагоддзем генетыкі і геномікі. Дзякуючы вывучэнню функцый геномаў жывых арганізмаў з'явіліся новыя тэхналогіі, якія адкрылі магчымасці да павышэння ўзроўню аказання медыцынскай дапамогі, удасканалення селекцыйнага працэсу і метадаў вядзення сельскай гаспадаркі. Так, калі раней, каб вывесці новы сорт, патрабаваліся гады і нават дзесяцігоддзі, то сучасныя метады дазваляюць значна паскорыць селекцыю, паменшыць выдаткі на яе. Новыя адкрыцці аказаліся карыснымі і ў прыродаахоўнай дзейнасці. Напрыклад, віды, якія знікаюць, можна множыць у культуры ін-вітра, а пасля перасаджваць у натуральнае асяроддзе.

НОВЫЯ БАНКІ

Вучоныя знайшлі зручны інструмент для збірання інфармацыі пра жывыя арганізмы, што бясспрэчна дапаможа ў справе захавання біяразнастайнасці, — банкі ДНК. Першая краіна, якая пачала ствараць такія «сховішчы», — Вялікабрытанія. І адзін з банкаў, дзе захоўваюцца ўзоры відаў, якія па прагнозах даследчыкаў у хуткім часе могуць знікнуць, называецца «Замарожаны каўчэг».

Першы банк ДНК чалавека таксама з'явіўся ў Злучаным Каралеўстве. Такая зручная крыніца дазваляе праводзіць шырокія даследаванні, вывучаць розныя захворванні, удасканальваць метады лячэння. Дзякуючы развіццю геномных тэхналогій медыцына паступова будзе станавіцца персаналізаванай.

Фота БелТА.

Вучоныя заяўляюць, што трэба лячыць не хваробу, а канкрэтнага чалавека, бо адны і тыя ж лекі могуць па-рознаму ўплываць на пацыентаў. Ужо сёння ў Злучаных Штатах ёсць прэпараты, пры прызначэнні якіх улічваюць генетыку чалавека.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЁСЦЬ РЫНАК — ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ

Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўласніка — акцыянераў украінскага публічнага акцыянернага таварыства «Матор Січ» і беларускай кампаніі «Сістэмы інвестыцый і інавацый» — тут ужо няма. Цяпер уласнікі — гэта дзяржаўныя арганізацыі. «Усе ўласнікі, якія тут былі, яны адмовіліся самі ад гэтага завода. Таму дзейнічайце. Гэта дзяржаўнае прадпрыемства з сённяшняга дня», — цытуе беларускага лідара БелТА.

Працэс вяртання прадпрыемства ва ўласнасць дзяржавы падрыхтаваны, і ўсе пытанні ў гэтай сферы павінны быць вырашаны на працягу бягучага месяца, даў даручэнне Прэзідэнт. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка крытычна выказаўся наконт Міністэрства транспарту і камунікацый, якое ў папярэдні перыяд самаўхілілася ад таго, што адбываецца на заводзе. Прэзідэнт падкрэсліў: тое, што ў дзяржавы не было акцый, — гэта не апраўданне. На думку беларускага лідара, галоўная задача — нармальная заработная плата ў людзей, і не важна, каму належаць акцыі.

«Завод павінен працаваць, чаго б гэта ні каштавала, — заявіў Прэзідэнт. — Заводу не толькі быць — гэты завод павінен мець перспектыву развіцця. І пакладзіце мне на стол архітэктурны праект і іншае з улікам таго, што тут робіць бізнес для пашырэння аэрапорта і іншае».

Ён дадаў, што сёння вытворчасць і мадэрнізацыя верталётаў, іх аднаўленне і рамонт даюць сапраўды добры кавалак працы, бо ў свеце такіх машын шмат.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на сітуацыю з цяжкасцямі пры пастаўках камплектуючых і запчастак ад традыцыйных партнёраў. Па словах беларускага лідара, у такім выпадку трэба шукаць новыя варыянты, а таксама сваімі сіламі ажыццяўляць вытворчасць неабходнага. «Не трэба хадзіць і думаць, што мы нічога не можам. Трэба займацца гэтай справай, калі ёсць рынак і верталёты для рамонту і мадэрнізацыі», — падкрэсліў ён.

Магчыма, пэўная дапамога і падтрымка можа быць аказана прадпрыемству і з боку дзяржавы, дадаў Прэзідэнт.

Аршанскі авіярамонтны завод быў створаны 12 ліпеня 1941 года, са снежня 1956-га атрымаў новае месца дыслакацыі на аэрадроме Балбасава і быў перайменаваны ў 571-ы авіярамонтны завод Міністэрства абароны СССР. За гады работы на ім ажыццяўляўся рамонт верталётаў, самалётаў — як ваенных, так і грамадзянскіх. На дадзены момант прадпрыемства працягвае рамантаваць і мадэрнізаваць ваенную і грамадзянскую авіяцыйную тэхніку, а яшчэ яно займаецца рамонтам абсталявання, камплектуючых, агрэгатаў і кантрольна-праверачнай апаратуры.

З 2015 года на тэрыторыі Балбасава ствараецца мультымадальны прамыслова-лагістычны комплекс — пра гэта таксама гаварылі на сустрэчы. Рэалізацыяй праекта займаецца ТАА «Брэміна груп», тэрмін рэалізацыі — 31 снежня 2023 года.

Зараз будуецца першая чарга — аўтамабільны тэрмінал са складскім будынкам і адміністрацыйна-бытавым корпусам для размяшчэння мытных і іншых дзяржаўных службаў. Аб'ект уключае ў сябе складское памяшканне з прыбудаваным адміністрацыйна-бытавым комплексам, стаянку грузавых аўтамабіляў, а таксама сеткі інжынернай інфраструктуры.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы закрануў тэму развіцця населенага пункта Балбасава, дзе і знаходзіцца завод. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў да 7 лістапада завяршыць работы па яго добраўпарадкаванні, а яшчэ звярнуць увагу на два фактары — сацыяльная інфраструктура і новыя рабочыя месцы. Прэзідэнт даручыў прадставіць план развіцця населенага пункта, які распрацоўваецца.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

❍ Каментарый у тэму

Міністр транспарту і камунікацый Беларусі Анатоль СІВАК:

— Што датычыцца завода, то інвестыцыйны дагавор, які быў заключаны міністэрствам транспарту з інвестарамі, не развіваецца так, як хацелася б, інвестар не выконвае свае абавязацельствы.

У гэтай сувязі паўсталі пэўныя прэтэнзіі да інвестара. У частцы гэтых прэтэнзій ёсць даручэнне кіраўніка дзяржавы, што краіна павінна больш актыўна займацца гэтым заводам.

З улікам таго, што ўзлётна-пасадачная паласа знаходзіцца ў кіраванні завода, а яна павінна сёння працаваць не толькі на завод, як заводскі аэрадром, а працаваць на цэлую групу лагістычных аб'ектаў, якія тут будуюцца. Таксама было прынята рашэнне, што паласа павінна быць дзяржаўнай.

У гэтай частцы пастаўлены задачы ў кароткі тэрмін зрабіць так, каб паласа прымала любыя тыпы паветраных суднаў, у першую чаргу — грузавыя.

Генеральны дырэктар ААТ «Аршанскі авіярамонтны завод» Павел СЛУЧАК:

— Прэзідэнт ацаніў бягучы стан спраў на прадпрыемстве, паставіў канкрэтныя задачы і тэрміны. Найперш — гэта істотнае павелічэнне загрузкі прадпрыемства, выхад на бясстратную працу, павелічэнне заработнай платы да нарматыўнай. І задача такая: каб да 2020 года гэта быў квітнеючы завод.

Фінансавая сітуацыя складаная, ёсць моцная закрэдытаванасць ад банкаў, ёсць дэбіторская запазычанасць. Таму рэалізацыя праектаў па рамонце тых дзесяці верталётаў, якія ўжо стаяць у ангары, дазволіць знізіць крэдытную нагрузку прыкладна на адзін мільён. Планаваныя праекты, якія таксама былі агучаны Прэзідэнту, дазволяць практычна разлічыцца з банкамі і жыць за ўласныя сродкі.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

КІРАЎНІЦТВА БЕЛЬГІІ НЕ СУСТРЭЛА ТРАМПА З-ЗА МАТЧА ЧС-2018

Дональда Трампа, які прыбыў у Брусель на саміт НАТА, не сустрэла найвышэйшае кіраўніцтва краіны. Як адзначае бельгійскае выданне Le Soir, у гэты час усё яно было занятае праглядам матча Францыя — Бельгія, які праходзіў у Санкт-Пецярбургу.

У аэрапорце Бруселя прэзідэнта ЗША сустракаў толькі прадстаўнік бельгійскага МЗС. Прэм'ер-міністр Бельгіі Шарль Мішэль падчас прыбыцця борта № 1 ВПС ЗША ў аэрапорт знаходзіўся ў фан-зоне ў горадзе Брэн-ле-Конт. Кароль Бельгіі Філіп і каралева Мацільда назіралі за паядынкам у Санкт-Пецярбургу, дзе і праходзіў сам матч. Разам з імі на VIP-трыбуне стадыёна знаходзіўся і кіраўнік МЗС каралеўства Дзідзье Рэйндэрс.

РАСІЯ ЗАКЛІКАЛА БРЫТАНІЮ РАСТЛУМАЧЫЦЬ, ЯКІЯ РАБОТЫ ВЯДУЦЦА Ў ЯЕ ХІМЛАБАРАТОРЫІ

Вялікабрытанія павінна растлумачыць, якія работы вядуцца ў хімлабараторыі Портан-Даўна і чаму ў іх у краіне «гуляюць» атрутныя рэчывы. Пра гэта заявіў на 88-й сесіі Выканаўчага савета АЗХЗ кіраўнік расійскай дэлегацыі Георгій Каламанаў.

«Праз чатыры месяцы з моманту інцыдэнту ў Солсберы, у якім пацярпелі расіяне Юлія і Сяргей Скрыпалі, сітуацыя з расследаваннем ніколькі не праяснілася, — адзначыў ён. — Адмова Вялікабрытаніі супрацоўнічаць з Масквой у правядзенні сумеснага расследавання, нядопуск расійскіх дыпламатычных прадстаўнікоў да нашых грамадзян насуперак усім дыпламатычным і консульскім канвенцыям, бясконцыя спробы Вялікабрытаніі маніпуляваць высновамі АЗХЗ падрываюць давер да гучных заяў з Лондана».

«Надышоў час, каб улады Вялікабрытаніі самі, нарэшце, дакладна растлумачылі, якія работы вядуцца ў лабараторыі Портан-Даўна — цэнтры па абароне ад хімзброі, дзе уласна, і вырабляўся той самы таксічны хімікат, які вядомы пад назвай «Навічок», — падкрэсліў Георгій Каламанаў. — Трэба, каб Вялікабрытанія паведаміла ў АЗХЗ, чаму ў іх у краіне «гуляюць» атрутныя рэчывы».

ТРАМП НАЗВАЎ ГЕРМАНІЮ ЗАЛОЖНІЦАЙ РАСІЙСКАГА ГАЗУ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп выступіў з крытыкай краін НАТА, якія адобрылі будаўніцтва газаправода «Паўночны паток — 2».

У гэтай сувязі Трамп у размове з журналістамі рэзка крытыкаваў Германію, назваўшы яе заложніцай Расіі. «Гэта непрыемна, што Германія заключае газавую здзелку з Расіяй, — заявіў ён. — Мы абараняем Германію, мы абараняем Францыю, мы абараняем усе гэтыя краіны, а тым часам шэраг дзяржаў заключае пагадненне з Расіяй на будаўніцтва газаправода».

«Мы павінны абараняць вас [ад Расіі], а вы аддаяце мільярды долараў у куфры Расіі, — працягнуў ён. — Германія знаходзіцца ў іх [Расіі] ў заложніках. Мы пэўна павінны звярнуць на гэта ўвагу».

«Германія цалкам кантралюецца Расіяй. Пасля будаўніцтва новага трубаправода больш за 70 % паставак прыроднага газу будуць паступаць з Расіі», — заявіў ён.

УНУК БРЭЖНЕВА ПАМЁР У КРЫМЕ

Андрэй Брэжнеў, унук генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, памёр у Крыме ад інфаркту, паведаміў ТАСС у аўторак старшыня рэгіянальнага аддзялення партыі «Радзіма» Канстанцін Кнырык.

«Так, сапраўды, ён памёр. Прычына смерці — інфаркт», — сказаў Канстанцін Кнырык. Паводле яго слоў, інфармацыю пра смерць 57-гадовага ўнука генеральнага сакратара ён атрымаў ад кіраўніка Севастопальскай арганізацыі партыі «Радзіма».

■ Парламенцкі дзённік

ВЫПЛЫВАЕМ БЕЗ ПАДТРЫМКІ

Але аптымальны фармат — сумесная праграма

Пра гэта казаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з новым кіраўніком місіі МВФ у нашай краіне Жакам МІНЬЯНАМ.

Міхаіл Мясніковіч запэўніў, што Савет Рэспублікі дастаткова сур'ёзна працуе з фондам і яго персаналам, у той або іншай ступені, але заўсёды знаходзіў паразуменне з кіраўнікамі місіі, і выказаў надзею, што работа з новым кіраўніком таксама будзе канструктыўнай і ўзаемакарыснай. Спікер паабяцаў, што ўлады Беларусі будуць гэтаму садзейнічаць.

— Мы, у прынцыпе, рэалізуем класічную праграму фонду, але без фінансавай падтрымкі, — выказаў сваё меркаванне па супрацоўніцтве з МВФ старшыня Савета Рэспублікі. — Хоць і парадаксальна, але гэта факт. Гэта навучанне плаваць не шляхам зразумення спосабаў трымання на вадзе, а, як кажуць у народзе, кінулі ў ваду — і выплывай.

Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што ў выніку ўнутранай збалансаванай палітыкі эканоміка краіны другі год расце досыць хуткімі тэмпамі. Такім чынам, беларускія ўлады, магчыма, крыху адхіляюцца па тэрмінах, але ў прынцыпе прытрымліваюцца матрыцы праграмы МВФ, забяспечваючы рост эканомікі. Пры гэтым кіраўнік верхняй палаты парламента заўважыў, што пры існаванні крэдытнай праграмы з фондам зніжэнне эканамічнага росту ў 2015—2016 гадах было б меншым.

— Адсутнасць праграмы з фондам не азначае адсутнасці рэформаў, мы іх праводзім, — рэзюмаваў Міхаіл Мясніковіч. — Ёсць сацыяльная лаяльнасць да пераўтварэнняў, якія адбываюцца ў нашай краіне. Узгодненая палітыка рэформаў праводзіцца паўсюдна, на ўсіх узроўнях і палітычнага кіравання, і эканамічных інстытутаў.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнуў асаблівую ўвагу свайго суразмоўніка на шэраг сістэмных дакументаў па лібералізацыі эканамічнай дзейнасці ў цэлым, якія былі прынятыя кіраўніком дзяржавы, парламентам і ўрадам у канцы мінулага года. Размова ідзе пра вялікі пакет нарматыўна-прававых актаў, прынятых у развіццё Дэкрэта № 7, і пра сам дэкрэт.

— Я заўсёды пазбягаю выразу «рэвалюцыйныя пераўтварэнні або рэформы», але хачу сказаць, што Дэкрэт № 7 і дакументы, якія прымаюцца ў яго развіццё, гэта цалкам новы падыход, новыя ўмовы эканамічнага развіцця, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Ён выказаў сумненні, што кіраўніцтва і персанал фонду ўдзялілі дастатковую ўвагу гэтым базавым дакументам і іх ацэнцы.

— Стратэгічна мы бачым для сябе найважнейшую задачу — падтрымаць эканамічны рост, знізіць уразлівасць эканомікі, удасканаліць механізмы сацыяльнай абароны, каб гэта стала здабыткам усіх слаёў грамадства, — абагульніў старшыня Савета Рэспублікі. — І менавіта скрозь гэту прызму мы хацелі б развіваць супрацоўніцтва з фондам. І канешне, аптымальны фармат — гэта сумесная праграма.

Міхаіл Мясніковіч даў зразумець, што Беларусь разлічвае на фінансавую дапамогу з боку МВФ. Ён нагадаў, што дзяржава выбудавала добрыя ўзаемаадносіны і адпаведную стратэгію з Групай Сусветнага банка і іншымі міжнароднымі арганізацыямі. «Але ўсе інвестары ўважліва чытаюць вашы справаздачы, і я думаю, пасля нашай гутаркі, сустрэчы ў Нацыянальным банку, ва ўрадзе будуць дадзены пазітыўныя сігналы міжнародным фінансавым арганізацыям, прыватным інвестарам па рабоце з Беларуссю, — выказаў надзею спікер. — Мы будзем рады бачыць фонд як нашага давернага дарадцу і намераны набліжаць пазіцыі, якія не супадаюць, засяроджвацца на агульным, а не падкрэсліваць адрозненні».

У сваю чаргу Жак Міньян пагадзіўся, што зробленыя Беларуссю намаганні ў грашова-крэдытнай і бюджэтна-падатковай палітыцы дазволілі стабілізаваць эканамічную сітуацыю, макраэканамічная палітыка, якая праводзілася ў крызіснай сітуацыі, была правільная і не дазволіла знізіць уразлівасць краіны. Ён адзначыў, што сітуацыя ў беларускай макраэканоміцы працягвае наладжвацца: паступова скарачаецца даларызацыя ў фінансавай сістэме, знешняя пазыка, па прагнозах МВФ, альбо застанецца на стабільным узроўні, альбо зменшыцца.

— Мы ведаем, што Беларусь праводзіць рэформы, магчыма, не такімі тэмпамі, як нам бы хацелася, але ёсць дакладны кірунак, па якім краіна рухаецца ў гэтым плане, — дадаў Жак Міньян.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

ВІВАТ, ФЕСТЫВАЛЬ!

Сёння, 12 ліпеня, вечарам на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы 27-га па ліку міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» — афіцыйнае адкрыццё. Фестываль-старажыл, які не мае аналагаў не толькі на тэрыторыі былога СССР, ужо закружыў у феерыі мастацтваў. А яго падзеі стануць інфармацыйнымі нагодамі для СМІ. У фестывалі прымаюць удзел прадстаўнікі з 41 краіны свету!

У 20.30 пачнецца нязменна яскравае, зачаравальнае, унікальнае па сваёй канцэпцыі дзейства.

На адкрыцці выступяць зоркі: Мікалай Баскаў, Алег Меньшыкаў і яго аркестр, Ігар Нікалаеў, Эмір Кустурыца і «Аркестр, які не курыць», Наталля Арэйра, Таісія Павалій і іншыя.

А незадоўга да пачатку згаданага вышэй шоу стануць вядомыя імёны прызёраў XVI дзіцячага конкурсу. За перамогу змагаліся 20 канкурсантаў з 20 краін свету. Упершыню — з Вялікабрытаніі і Канады. «Гран-пры» — 5 тысяч долараў.

Заўтра, 13 ліпеня, — першыя выпрабаванні для ўдзельнікаў XXVII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні з 21 краіны. Раней на ім не выступалі прадстаўнікі Гвінеі і Егіпта...

Вось ужо чацвёрты раз праходзіць фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». У ім прыме ўдзел больш за 130 творчых калектываў розных напрамкаў: тэатры, перформеры, паэты, харэографы, лялечныя тэатры і калектывы fire-show. Фэст збярэ больш за 600 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны і Швецыі. У праграме каля 80 мерапрыемстваў розных кірункаў і жанраў.

І канешне, любімая тэма для абмеркавання гараджанамі — фестываль. Тут даўно называюць яго «Славянкай». І часта тутэйшыя адно аднаму задаюць пытанні: «Пойдзеш на «Славянку?», Хадзіў? Ну і як там?». Ды добра! Як заўсёды, весела, цікава, адным словам — пазітыў!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХТО СПЯВАЕ АПОШНІМ?

Сёння на «Славянскім базары» пройдзе жараб'ёўка ўдзельнікаў Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2018». Беларусь прадстаўляе 27-гадовы спявак, акцёр мюзіклаў і выкладчык Універсітэта культуры і мастацтваў Яўген Курчыч.

Ацэньваць канкурсантаў будзе прадстаўнічае міжнароднае журы, у якое ўвайшлі знакаміты італьянскі спявак Раберціна Ларэці, уругвайская спявачка і актрыса Наталля Арэйра, намеснік генеральнага прадзюсара Белтэлерадыёкампаніі Вольга Шлягер, народны артыст Украіны Уладзімір Грышко, народная артыстка Казахскай ССР спявачка Роза Рымбаева, папулярная спявачка і актрыса з Чэхіі Міхаэла Наскова, уладальнік Гран-пры конкурсу 2013 года польскі спявак Міхал Качмарэк. Старшыня журы — расійскі кампазітар Аляксандр Марозаў, у якога, дарэчы, 14 ліпеня адбудзецца ў Летнім амфітэатры юбілейны творчы вечар «У святліцы маёй светла».

Паўфінал конкурсу збярэ гледачоў і ўдзельнікаў 13 ліпеня ў канцэртнай зале «Віцебск». Фінал, куды трапяць 15 найлепшых выканаўцаў, традыцыйна адбудзецца ў Летнім амфітэатры на працягу двух дзён: «Славянскі хіт» прагучыць 14 ліпеня, «Фестывальны хіт» — 15-га. Галоўная інтрыга песеннага спаборніцтва — каму дастануцца адмысловыя ўзнагароды «Ліра», грашовыя прэміі за першыя тры месцы і Гран-пры (між іншым, апошні журы мае права наогул не прысуджаць) — раскрыецца, як заўжды, на ўрачыстым закрыцці XXVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

■ Запрашальнік

МІНСК — ВЕРТАЛЁТНАЯ СТАЛІЦА СВЕТУ

Верталётны чэмпіянат свету адбудзецца на аэрадроме Баравая з 23 да 29 ліпеня і збярэ больш за 100 пілотаў з Беларусі, Расіі, Германіі, Украіны, Польшчы, Кітая, Аўстрыі і Вялікабрытаніі. Каманды Чэхіі і Швейцарыі будуць выступаць у якасці назіральнікаў.

Усе ўдзельнікі будуць спаборнічаць у выкананні чатырох практыкаванняў: «Навігацыя», «Паралельны палёт на дакладнасць», «Паралельная развозка грузаў» і «Паралельны слалам». Нацыянальныя каманды выступяць на двух тыпах верталётаў: Мі-2 і Робінсан-44.

Беларускія авіятары — у ліку фаварытаў турніру, на папярэднім чэмпіянаце ў Польшчы яны заваявалі сярэбраныя ўзнагароды. Нашу краіну прадставяць сем экіпажаў, у склад нацыянальнай каманды ўвайшлі самыя знакамітыя спартсмены абароннага таварыства: майстры спорту міжнароднага класа Андрэй Роганаў, Уладзімір Бугаёў, Мікіта Лапцеў, Уладзімір Стрыянок, Антон Данчанка, Аляксандр Грышчанка, Аляксей Мачанскі. Жаночая каманда прадстаўлена двума экіпажамі.

Падчас чэмпіянату свету на аэрадроме Баравая 28 і 29 ліпеня пройдзе штогадовы авіяцыйны фестываль #пронебо. Наведвальнікі ўбачаць больш за 30 лятальных апаратаў — ад аэрастатаў да самалётаў. Самымі відовішчнымі ў праграме абяцаюць стаць верталётныя гонкі. Хэдлайнерам авіяфестывалю #пронебо-2018 стане гурт «Піца», які выступіць на канцэртнай пляцоўцы, разгорнутай проста на тэрыторыі аэрадрома.

Верталётны мундзіяль увайшоў у лік трох чэмпіянатаў свету, якія пройдуць у 2018 годзе ў Беларусі. Ён таксама стане апошнім спаборніцтвам на аэрадроме Баравая да яго поўнага закрыцця. Беларусь падала заяўку на арганізацыю чэмпіянату ў Міжнародную авіяцыйную федэрацыю вясной 2016 года, яе прэзідэнт Жак Берло, вывучаючы магчымасці правядзення турніру ў Мінску, асабіста наведаў спаборніцтвы ў Баравой і прыняў станоўчае рашэнне. Нагадаем, у Беларусі ўжо праводзілася сусветнае першынство сярод верталётчыкаў, але было гэта ў далёкім 1978 годзе ў Віцебску на тэрыторыі аэраклуба ДТСААФ.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Як здорава, што ўсе мы тут...

Рэгіянальны фестываль-конкурс бардаўскай песні «Музыка сэрцаў», прысвечаны памяці Уладзіміра Высоцкага, у пяты раз пройдзе ў Навагрудскім раёне на беразе легендарнага возера Літоўка, апетага ў паэме Адама Міцкевіча «Гражына». Як чакаецца, на свята бардаўскай песні 21—22 ліпеня прыедуць як сольныя аўтары-выканаўцы, так і калектывы з розных рэгіёнаў Беларусі. Акрамя музычнай часткі, у праграме запланаваныя таксама тэматычныя выстаўкі, сувенірны гандаль, спартыўныя мерапрыемствы, майстар-класы і творчыя сустрэчы.

Вікторыя ЗАХАРАВА

■ Мясцовы фэст

Елі смаўжоў, секліся на шаблях, чыталі вершы

Чым займаліся на ваенна-гістарычным фестывалі ў Міры

Казацкая кавалерыя, польскія ўланы, рэгулярная руская пяхота, егерскія палкі, шэваліжэры, гусары, ружэйная страляніна, залпы пушак і бязлітасныя сутычкі напалеонаўскіх і рускіх войскаў на полі за мястэчкам Мір і нават на яго цэнтральнай плошчы. Яскравая, гучная і відовішчная рэканструкцыя гістарычнай «Бітвы пад Мірам», якая здарылася тут у далёкім 1812-м, на два дні ахапіла сёлета пасёлак, яго жыхароў і гасцей.



Асноўнае дзеянне ваенна-гістарычнага фестывалю пабудавана на рэальных падзеях. У Міры вырашана стварыць пастку для наступаючай напалеонаўскай арміі. Яе заспелі знянацку яшчэ на падыходзе да Міра, пасля атакавалі ў самім мястэчку. Тым часам асноўныя сілы рускіх войскаў працягнулі адступленне, выйграўшы такія неабходныя ім гадзіны.

Паглядзець падчас рэканструкцыі было на што. Сутычкі коннікаў з пяхотай, дым і страляніна, мільгаценне шабляў, «забітыя», наступленні сценкай і абарона спінай да спіны, рукапашныя бойкі...

— Задумка цудоўная, эмоцыі неверагодныя, першыя гучныя залпы ружжаў — увогуле нечаканасць. Засмучае толькі, што цяжкавата было пабачыць усё, бо баі амаль адначасова ішлі па ўсім перыметры плошчы, — дзяліліся ўражаннямі гледачы.

Тэрыторыя вакол летняга амфітэатра ў Міры ператварылася ў першы дзень у «Французскі дворык», дзе можна было акунуцца ў атмасферу сярэдневяковага замежжа. Гасцям прапанавалі згуляць у картачныя гульні штос і базільён або шахматы з шашкамі, скласці неверагодна цяжкі пазл з маленечкіх кавалачкаў ці паваражыць на картах.

Аматары мастацтва нацешыліся спектаклем народнага лялечнага тэатра «Батлейка» з Міра і адпачылі ў салоне «Адам Міцкевіч запрашае...». Даспадобы прыйшлося гледачам і выступленне хлопцаў з ансамбля старажытнай музыкі «Хардвуд».

Надвячоркам тут арганізавалі майстар-класы для ахвотных навучыцца танцаваць французскі кацільён і правільна есці смаўжоў. Экзатычная страва — «Смаўжы па-бургундску» — карысталася вялікім попытам. Далікатэс імкнуліся пакаштаваць усе, тым больш што тым, хто часта ваўся ўпершыню, абяцалі, што можна загадваць жаданне, якое абавязкова збудзецца.

Больш за 300 рэканструктараў бітвы пад Мірам арганізавалі непадалёк ад замка сапраўдны шатровы лагер. Паўдзельнічаць у бітве ў Беларусь з'ехаліся клубы з Расіі, Польшчы, Бельгіі, Францыі. Уявіце, якое моцнае жаданне займацца сваёй справай трэба мець, каб правезці цераз мяжу такі ваенны скарб: узбраенне, коней, касцюмы.

Рэканструкцыя бітвы другога дня, якая прайшла ў полі, была яшчэ больш відовішчная і насычаная. Да бою далучыліся гарматы, ружжы не змаўкалі, а коні, учуўшы абсяг, проста праляталі каля гледачоў, у якіх дух займала, калі перад іх тварамі пачыналася сеча.

Шаблі, дарэчы, у адрозненне ад стрэлаў, самыя сапраўдныя і вельмі вострыя. У гэтым прысутныя ўпэўніліся, калі пабачылі спаборніцтвы па сячэнні. 12 удзельнікаў у імгненне вока ссякалі кавалак палкі, на якой вісела шапка, ды так, што ўбор ізноў падаў на тую частку трысціны, што засталася. А ўявіце сабе, як умельцы наразалі на часткі пластыкавую бутэльку з вадой, якая пры гэтым працягвала стаяць... Спачатку адна, а потым і тры адразу.

Што і казаць, сёлетнюю рэканструкцыю будуць памятаць да наступнага года, калі Мір ізноў паспрабуюць захапіць напалеонаўскія войскі.

Больш здымкаў — на сайце zviazda.by.

Ірына СІДАРОК

■ Здарэнні

Шэсць дзён у лесе

правяла 89-гадовая жыхарка Пастаўскага раёна

Увечары 6 ліпеня жыхар вёскі Хрыстова звярнуўся ў Пастаўскі РУУС. Ён расказаў, што ўжо суткі не бачыў сваю старую суседку. На месца падзей выехалі супрацоўнікі міліцыі. Жанчына, якая таксама жыве ў гэтай вёсцы, паведаміла, што 5 ліпеня яна бачыла, як бабуля ішла ў лес.

— Згадаць, у што была адзета старая, сведка не змагла, — сказалі ў прэс-службе УУС Віцебскага аблвыканкама. — Але прыгадала, што ў руках яна трымала сіні пакет. Раніцай 11 ліпеня верталёт МНС прачэсваў чарговы квадрат лесу. І міліцыянер заўважыў унізе нейкую сінюю пляму і няясны сілуэт побач з ёй.

Калі міліцыянеры і ратавальнікі дабраліся да жанчыны, яна ляжала на паляне ў стане моцнага абязводжвання, але ў прытомнасці. Пасля аказання першай дапамогі пенсіянерка расказала, што пайшла ў лес па травы, але ёй стала дрэнна. Пасля трапіла ў нейкае балота, а затым выбралася на паляну. Там яе і ўбачылі з паветра...

Афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях па Мінскай вобласці Анастасія ШВАЙБОВІЧ нагадвае асноўныя правілы паводзін у лесе:

— Вазьміце з сабой компас, мабільны тэлефон з зараджанай батарэяй, свісток, запалкі, нож, невялікі запас вады і прадуктаў. Пажылым людзям трэба абавязкова мець пры сабе медыкаменты. Адзявайцеся ярка, бо ў камуфляжы вас могуць не знайсці і з трох метраў, а не тое што пабачыць з паветра. Добра будзе, калі вы налепіце святлоадбівальныя палоскі або малюнкі. Старайцеся таксама запамінаць па дарозе як мага больш прадметаў — незвычайныя дрэвы, валуны. Тады будзе нашмат прасцей вяртацца назад да зыходнай пазіцыі, калі вы зразумееце, што ідзяце не туды.

ЗАГІНУЎ АФІЦЭР

Сумная вестка прыйшла ўчора ўвечары. Пры скачках з парашутам загінуў афіцэр сіл спецыяльных аперацый.

— З-за рэзкай змены кірунку ветру ў прыземным слоі ў маёра Яўгена Салавейкі адбылося гашэнне купала парашута. У выніку афіцэр атрымаў траўмы, несумяшчальныя з жыццём, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.

На месцы здарэння зараз працуе ведамасная камісія, каб высветліць падрабязнасці.

Міністэрства абароны выказвае спачуванне родным і блізкім загінулага. Ім будзе аказана ўся неабходная дапамога.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

ЗАМАРОЖАНЫ КАЎЧЭГ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Банкі ДНК дазваляюць сэканоміць і грошы, і час: вучоным не трэба ўвесь час шукаць узоры, выдзяляць гены. Тым больш што навукоўцы розных краін гатовы дзяліцца сваімі здабыткамі — з 2011 года пачала стварацца глабальная сусветная сетка банкаў ДНК.

У нашай краіне банк ДНК створаны на базе Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі. У 2016 годзе ён прызнаны нацыянальным набыткам. У спецыяльным памяшканні, абсталяваным халадзільнікамі і крыяёмістасцямі, захоўваюцца калекцыі ДНК раслін, жывёл, мікраарганізмаў і чалавека. Сёння там больш за 12 тысяч узораў!

Адна з галін, якой паслужаць сучасныя тэхналогіі, — сельская гаспадарка. Новыя веды дазволяць ствараць культуры, «надзеленыя» пэўнымі карыснымі ўласцівасцямі. І сёння беларускім вучоным ёсць з чым працаваць. Так, Інстытут генетыкі і цыталогіі з'яўляецца трымальнікам калекцый сартоў такіх культурных раслін, як тамат, перац, фізаліс, лён і іншых.

Толькі летась у інстытуце выконвалася 76 навуковых праектаў. Актыўна даследуюцца генетычныя рэсурсы свойскіх жывёл (буйной рагатай жывёлы і свіней). Дзякуючы скрынінгу можна выявіць носьбітаў неспрыяльных генаў і выключыць іх з селекцыйнай работы.

Сярод пастаўшчыкоў матэрыялу для нацыянальнага банка ДНК — у тым ліку нацыянальныя паркі і запаведнікі, яны прапануюць біялагічны матэрыял рэдкіх і знікаючых раслін.

Інстытуту генетыкі і цыталогіі ўдалося сабраць і калекцыю ДНК зубра. Даследаванні дазволілі вызначыць асаблівасць беларускай папуляцыі. Так, на польскай тэрыторыі пражывае больш чыстая белавежская лінія, у той час як у беларускіх зуброў пацвердзілася гібрыднае паходжанне (белавежска-каўказкая лінія). Да таго ж вучоныя звярнулі ўвагу на адсутнасць у нашай папуляцыі генаў, якія адказваюць за фарміраванне імунітэту. Каб вырашаць такую праблему, трэба падключаць да племянной работы асобін з польскай папуляцыі.

Калекцыя ДНК чалавека, сабраная ў інстутуце, выкарыстоўваецца не толькі для даследаванняў, звязаных з медыцынай. Тут створаны і банк ДНК спартсменаў. Акрамя таго, з просьбай вызначыць так званыя гены спартыўнай паспяховасці сюды звяртаюцца кіраўнікі спартыўных школ і проста бацькі, чые дзеткі мараць пра перамогі ў разнастайных спаборніцтвах.

Як заўважыла **намеснік дырэктара Інстытута генэтыкі і цыталогіі Алена ГУЗЕНКА,** узоры ДНК могуць выкарыстоўвацца як для ўласных патрэб, так і для абмену паміж лабараторыямі іншых краін, якія займаюцца малекулярна-генетычнымі даследаваннямі. Сёння існуюць тысячы, мільёны сартоў розных культур. Ахапіць гэтую біялагічную разнастайнасць і вывучыць генетычны матэрыял не пад сілу ў адзіночку. Таму краіны аб'ядноўваюца для правядзення маштабных даследаванняў.

ШТО ГЭТА?

Мала проста збіраць калекцыі ДНК каб не заблытацца ў вялізнай колькасці інфармацыі, важна кожны ўзор суправаджаць штрых-кодам.

ДНК-штрыхкадзіраванне шырока выкарыстоўваецца ў свеце. Вучоным яно дапамагае вызначыць, да якога віду адносіцца пэўны жывы арганізм. Прычым для работы сістэматык можа выкарыстоўваць любы матэрыял: шэрсць, косці, сліну, насякомых на любой стадыі развіцця і нават экскрэменты. Трэба толькі вызначыць ДНК і параўнаць свой узор з іншымі (зайсці пры дапамозе камп'ютара ў спецыяльную мабільную базу).

Вучоныя заяўляюць, што трэба лячыць не хваробу, а канкрэтнага чалавека, бо адны і тыя ж лекі могуць па-рознаму ўплываць на пацыентаў. Ужо сёння ў Злучаных Штатах ёсць прэпараты, пры прызначэнні якіх улічваюць генетыку чалавека.

Зразумела, раней, калі чалавек, зыходзячы са сваіх ведаў і меркаванняў, вырашаў, куды «запісаць», тую ці іншую расліну, маглі дапускацца пэўныя памылкі. Таму часта калекцыі перапраўляліся, перавызначаліся. Напрыклад, гэта датычылася гербарыяў, музейных калекцый. А сёння, калі сістэматыкай займаецца камп'ютар, можна пазакрываць пытанні, звязаныя з вызначэннем узораў.

Новыя веды выкарыстоўваюцца ў крыміналістыцы. Так, калі на целе забітага знайсці лічынкі насякомых, вызначыўшы пры дапамозе ДНК, што гэта за від і як ён развіваецца, можна даведацца пра час смерці.

Яшчэ ДНК-інфармацыя паслужыць для папярэджання кантрабанды — не толькі не дазволіць вывезці віды, якія знаходзяцца пад аховай, але і высветліць, што за прадукцыя перавозіцца цераз пэўную тэрыторыю. Часам махляры спрабуюць за свініну выдаць мяса незаконна здабытага дзіка ці перавозяць праз мытню рыбу як танную (каб сэканоміць на выплатах), а пасля прадаюць яе па высокіх цэнах. Можна нават сачыць за якасцю прадукцыі, вызначаць, ці ўтрымлівае яна прадукты жыццядзейнасці насякомых, ад якіх паспелі пазбавіцца.

Такія веды дыпамогуць папярэдзіць завоз у краіну каранцінных аб'ектаў (напрыклад, на пасадачным матэрыяле, які паступае ў нашу краіну з-за мяжы, могуць «падарожнічаць» злосныя шкоднікі і хваробы).

НА СЛУЖБЕ ЧАЛАВЕЦТВУ

Інтэнсіўнае выкарыстанне біялагічных рэсурсаў у самых розных галінах, ад вытворчасці прадуктаў харчавання да медыцыны і касметалогіі, прымусіла вучоных задумацца над пытаннем аб захаванні біяразнастайнасці. Невыпадкова з'явіліся такія тэрміны як «біяразведка» (выяўленне рэсурсаў, якія могуць мець камерцыйную каштоўнасць) і «біяпірацтва». Многія гады прадстаўнікі краін з развітой эканомікай падарожнічалі па Афрыцы, Азіі, Лацінскай Амерыцы, збіралі ўзоры флоры і фаўны зусім бясплатна. Сабраны матэрыял выкарыстоўваўся ў індустрыі, а пасля прадаваўся па рыначных цэнах, у тым ліку і ў мясціны, адкуль ён быў узяты. Краіны ж, якія з'яўляліся крыніцай генетычных рэсурсаў, не атрымлівалі ніякіх выгад. У некаторых выпадках выкарыстоўваліся і веданні карэнных народаў. Так, ад іх даследчыкі даведваліся пра ўласцівасці і карыснасць пэўных жывых арганізмаў, раслін.

Каб спыніць біяпірацтва, а таксама ўрэгуляваць пытанні, звязаныя з выкарыстаннем такіх рэсурсаў, была прынята Канвенцыя аб біялагічнай разнастайнасці. Сёлета адзначалася 25-годдзе з моманту ўступлення яе ў сілу.

Цяпер перадача рэсурсаў адбываецца па пэўнай працэдуры. Прычым «расплата» за доступ да генетычных рэсурсаў і іх выкарыстанне можа быць не толькі грашовая. Гэта можа быць і дадатковая адукацыя і забеспячэнне навуковай літаратурай, прыборамі, рэактывамі, і сумесныя навуковыя распрацоўкі.

Трэба сказаць, навукоўцы звярнулі ўвагу і на тое, што біялагічныя рэсурсы не трэба разглядаць выключна як сыравіну для атрымання выгад. Прырода служыць чалавеку і апасродкавана. Прычым многае пра яе мы яшчэ не ведаем.

Таму нядаўна была створана новая Міжурадавая навукова-палітычная платформа па біяразнастайнасці і экасістэмных паслугах (IPBES), якая якраз займаецца зборам інфармацыі, звязаным з вывучэннем прыроднага патэнцыялу і яго ўплыву на жыццё чалавецтва. У даследаваннях занятыя найлепшыя вучоныя ўсяго свету, у тым ліку і Беларусі.

— Экасістэмныя паслугі дастаткова разнапланавыя, іх нельга разглядаць як проста вытворчасць арганічнай прадукцыі. Гэта і звязванне вуглякіслага газу, абарот азоту ў атмасферы, функцыі, звязаныя з ачысткай вады, рэгуляваннем змянення клімату, ёсць і культурны ўплыў на чалавека. Прычым некаторыя сувязі мы можам пакуль не ўсведамляць, — заўважае **кандыдат біялагічных навук, загадчык сектара экалагічнай ацэнкі пераўтварэння навакольнага асяроддзя Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах НАН Беларусі Руслан НАВІЦКІ.**



Для прыкладу, адно з навуковых даследаванняў, якое выконвалася вучонымі для IPBES, датычылася апылення. Яны падлічылі, што дзякуючы апыляльнікам (а гэта не толькі насякомыя, але і птушкі, некаторыя рэптыліі і г. д.) чалавецтва атрымлівае 35 працэнтаў арганічнай прадукцыі, што ўжываецца ў ежу (гэта глабальны сусветны прадукт на 250-500 мільярдаў долараў у год).

Колькасць інфармацыі, звязанай з вывучэннем генетычных рэсурсаў, з кожным годам будзе расці, адпаведна, гэта пацягне за сабой змены ў сістэме адукацыі. Спатрэбяцца прафесіяналы, якія будуць умець чытаць і выкарыстоўваць такія веды. Сярод спецыяльнасцяў, якія становяцца запатрабаванымі ў XXI стагоддзі, — біяінфарматыка (гэта спалучэнне адукацыі праграміста і біёлага).

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

Дата, время и место проведения аукциона	**15 августа 2018 г.** в 14.00 г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов	г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 16, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел. (8 01797) 55-7-35, тел./факс (8 01797) 55-7-36. С момента опубликования извещения до 16.00 13 августа 2018 г. В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
Порядок осмотра земельных участков на местности	В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
Условия проведения аукциона	Наличие не менее двух участников
Продавец	Мядельский сельский исполнительный комитет
Организатор аукциона	Мядельский сельский исполнительный комитет: **г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15-16, тел. (8 01797) 55-7-35, тел./факс (8-01797) 55-7-36**
Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе	Размер задатка: 10 % от начальной цены. Документы: заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации. Реквизиты: р/с BY54AKBB36410619001106100000 ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601 г. Молодечно, код AKBBBY21601, УНН 600380436, код платежа 04901
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта; соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне
ЛОТ №1	
Адрес объекта и его наименование	Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Новая, участок № 6 площадью 0,1663 га (кадастровый номер 624083103601000261). **Начальная цена 30 000 (тридцать тысяч) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены
Ограничения в использовании земельного участка	Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне озера Нарочь на площади 0,1663 га
Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Имеется возможность газификации
Информация о затратах на организацию и проведение аукциона	Всего 2302 руб. 19 коп., в том числе: формирование земельного участка – 1077 руб. 10 коп.; оформление градостроительного паспорта – 924 р. 49 коп.; государственная регистрация земельного участка – 63 руб.; стоимость извещения о проведении аукциона – 237 р. 60 коп.

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703		
Продавец	Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13		
Предмет аукциона (одним лотом)			
Наименование	Общ. пл.	Инв. номер	Адрес (номер дома)
Месторасположение предмета аукциона: Минская обл., Слуцкий р-н, **г. Слуцк**, ул. Максима Богдановича			
Здание кирпичное	40,4 кв. м	640/С-84557	д. 136А/1
Здание склада	286 кв. м	640/С-84559	д. 136А/2

Сведения о земельном участке: пл. 0,1009 га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий. Ограничения прав: водоохранная зона реки Случь, площадь 0,1009 га

Начальная цена с НДС 20 % – 36 416,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.06.2018

Дата и время проведения аукциона	**07.08.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**03.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Сямейная газета

Выпуск № 13 (104)

КУРОРТНЫ РАМАН

Сонца, мора, пляж. Анекдот пра ненадзеты заручальны пярсцёнак, бо «ў ім летам горача». Песенька Трафіма пра горад Сочы. Нават фільм «Каханне і галубы». Усё за тое, каб у адпачынку адпачыць ад сямейнага жыцця, каб, як тыя Вася ці Раіса Захараўна, кінуцца з галавой у вір новых пачуццяў і адчуванняў. Прыкладна так у нашай свядомасці малюецца курортны раман. Суцэльнае мі-мі-мі, шашлычок пад каньячок, інтрыжка з чалавекам, аб існаванні якога некалькі дзён назад і паняцця не меў, пра якога не ведаеш насамрэч нічога — нярэдка нават прозвішча яго так і застаецца невядомым. Ніякіх абавязкаў, ніякай адказнасці. Сустрэліся, як у моры караблі, і гэтаксама разышліся.

Хто курортны раман не перажыў хоць раз, яго прыдумляе або імкнецца ўсё ж перажыць. Бо як жа без гэтага? Хто хоць аднойчы перажыў — чамусьці не часта гэтым хваліцца. Асабліва калі пройдзе нейкі час, калі сціхнуць узрушаныя пачуцці, калі хочаш не хочаш, а трэба вяртацца да прывычнага жыцця. І нават калі не будзе бурных скандалаў, а пасля гэткіх самых палкіх прымірэнняў, як у тым вядомым фільме, калі другая палова нават і не даведаецца пра прыгоды на адпачынку (ці зробіць выгляд, што не ведае), ад самога сябе не падзенешся нікуды. Таму што «должен чем-то отличаться человек от кошек и собак», таму што дадзена нам здольнасць аналізаваць і ацэньваць, «капацца ў сабе». І да чаго дакапаешся ў гэтым выпадку — вось у чым пытанне.

Найлепшы варыянт развіцця падзей — гэта калі пасля курортнага рамана пачынаеш разумець, што пастаянны спадарожнік ці спадарожніца — сапраўдны падарунак лёсу і нікога больш табе не трэба. І апраўданне ёсць выдатнае, калі раптам пачуццё віны пачне тузаць, — «Усё спазнаецца ў параўнанні». Паспрабаваў, параўнаў, зрабіў выснову: «сваё — найлепшае». Хэпі-энд, новы віток рамантычных адносін у сям'і, лад і гармонія. Пры адной умове. Калі «свая» ці «свой» ні аб чым не здагадаецца. Або, здагадаўшыся, даруе. Верагоднасць, што будзе наадварот, прыкладна напалову. Адпаведна і верагоднасць хэпі-энду.

Можа здарыцца і так, што на тым курорце сапраўды сустрэнеш «свайго» чалавека. (А да гэтага, высветліцца, жыў з «чужым».) І ён адчувае тое самае. Што ж, у жыцці бывае ўсякае. І калі дзеля новага пачуцця абое гатовыя да цяжкага расставання з тымі, хто чакае дома, да падзелу маёмасці, да змены прывычнага ладу жыцця, да пераезду ў іншы горад (нават у іншую краіну) — што ж, гэта сапраўднае. І хто яго, сапраўднае, аспрэчыць і асудзіць? Але ці шмат такіх выпадкаў вядома? Не ў кіно і кнігах, а ў жыцці?

А вось калі для аднаго з герояў курортнага рамана гэты самы раман — усур'ёз і надоўга, а для другога — чарговая летняя прыгода... Што ж, першаму можна толькі паспачуваць: безнадзейнае чаканне тэлефоннага званка ці паведамлення, успаміны, якія не даюць спакою ні днём, ні ноччу, трывожная насцярожанасць дамашніх, якія пра нешта здагадваюцца, а спытаць не асмельваюцца. І добра, калі хопіць розуму і сіл паставіць у тых курортных перажываннях кропку, і добра, калі ўжо не будзе надта позна...

Зрэшты, можа быць усё значна прасцей — ні адносін сур'ёзных, ні адказнасці, ні абавязкаў. Як у моры караблі — кожны пакіраваў у свой порт, не ўзяўшы на борт ні лішняга грузу, ні пасажыраў... «Без слез, без жизни, без любви...» Але каму і навошта гэта патрэбна?

Які варыянт здарыцца з вамі, калі па курсе вашага летняга падарожжа ўсплыве такі заманлівы і доўгачаканы курортны раман? Ніхто, нават вы самі, не здолее нават прыблізна ўгадаць. Але галоўны выбар — ці станавіцца дзеючай асобай гэтага рамана — усё роўна заўжды застаецца ў кожнага.

Ваша «Сямейная газета».

■ Быць разам

«ДА НАС ПРЫПЯЦЬ СТУКАЕ Ў ПАРОГ»

Лаўрэаты конкурсу «Сям'я года — 2017» — пра продкаў-вандроўнікаў і буслоў над дахам хаты

ВЁСКА, дзе вырашылі пабудаваць хату Рыгор і Марына ХВЯСЮКІ, амаль апусцела, наўрад ці там набярэцца з пяток жылых дамоў. Аднак сям'я з Мікашэвіч прыязджае сюды кожную вольную часіну. Дабудоўвае другі паверх і садзіць дрэвы, плануе абжываць мясціну ўсур'ёз. «Каб дзеці ведалі, што батоны не на дрэвах растуць», — жартуюць у размове бацькі. Але і самі прызнаюцца: нешта цягне сюды, да рэчкі, буслоў і жабіных «аркестраў».

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Ініцыятыва

УСМЕШКІ НАШЫХ ЗАЙЧЫКАЎ

Як пераадолець «непрыгожы» дыягназ?

Схаваць малога, нікому не паказваць да аперацыі, хлусіць, калі раптам хто пачне задаваць недарэчныя пытанні... Менавіта так часта рэагуюць бацькі, у якіх нарадзіліся дзеткі з расколінамі губы і паднябення (у народзе «заечая губа» і «воўчая зяпа»). Нягледзячы на тое, што сёння ўрачы і сапраўды робяць цуды — часам пасля аперацыі шрамік цяжка заўважыць, — людзі працягваюць саромецца падобнага дыягназу. І гэта прытым, што колькасць падобных паталогій пастаянна павялічваецца, сёння на кожныя 500—700 нованароджаных прыпадае адно такое немаўля.

Прычыны сур'ёзнай заганы развіцця твару могуць быць самыя розныя: вірусныя інфекцыі, прыём лекаў і вітамінаў і нават проста стрэс будучай мамачкі ў першыя тыдні цяжарнасці. Сучасная дыягностыка дапамагае выявіць паталогію ўжо на другім этапе скрынінгу (на 19—21 тыдні), але бывае, што падчас ультрагукавога даследавання будучыя «зайчыкі» прыкрываюць тварык ручкамі і праблема «ўсплывае» толькі ў радзільным доме.

І тым не менш хібы падчас ультрагукавых даледаванняў — добры шанц на новае жыццё. Справа ў тым, што напалоханыя падобным дыягназам жанчыны часта перарываюць цяжарнасць, ды самі медыкі даюць ім накіраванні на аборт, не ўлічваючы, што сучасная медыцына навучылася пераадольваць такія складанасці. Калі расколіна — адзіная праблема і ў будучага малога ўрачы не выяўляюць іншых заган, не трэба хвалявацца. Такі дыягназ не прысуд. У вас будзе цудоўны любімы малы. Ніякіх адхіленняў у разумовым і фізічным развіцці ў такіх дзетак няма. Адзінае, што хваляванняў, пытанняў, намаганняў прыйдзецца вынесці ў разы больш, чым звычайным бацькам, якім лёс не падкінуў такую праблему.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

■ Ведай свае правы

КОШТ «СУРАГАТНАГА» НЕМАЎЛЯЦІ

Апладняюць за мяжой, выношваюць у Беларусі

Жыхарка беларускага мястэчка, не забруджанага радыяцыяй, замужам, мае дзіця, узрост ад 20 да 35 гадоў, здаровая, не асуджалася за злачынства і не была падазраванай у крымінальнай справе, не п'е, не курыць, не займаецца сексам падчас цяжарнасці. Гэтым і мноству іншых крытэрыяў павінна адпавядаць, згодна з законам і патрабаваннямі заказчыкаў, айчынная сурагатная маці. Каб атрымаць дзіця, патэнцыйныя бацькі ў сваю чаргу абавязваюцца мець медыцынскую даведку, што не могуць нарадзіць сваё немаўля, забяспечваць сурагатную маці ўсім неабходным да родаў і заплаціць на 30 % больш, калі народзіцца не адно малое, а два.

Дазвол ад мужа на цяжарнасць

Большасць пар, якія хочуць атрымаць дзіця ад беларускай сурагатнай маці, — гэта расіяне, хоць сустракаюцца і грамадзяне Украіны, Казахстана. Беларусаў-заказчыкаў, дарэчы, вельмі няшмат. Для замежнікаў гэтая паслуга ў нас і таннейшая, чым дома, і гарантыі на яе большыя. Бацькамі немаўляці ад сурагатнай маці, згодна з беларускімі законамі, могуць быць толькі генетычныя — тыя, хто даваў матэрыял для апладнення або выкарыстоўваў донарскую яйцаклетку і сперму патэнцыйнага бацькі. Узрост заказчыкаў дзіцяці пры гэтым не мае значэння. Важны юрыдычны момант пры гэтым: сурагатная маці не можа быць адначасова і донарам яйцаклеткі. Акрамя таго, патрэбна абавязковая згода мужа сурагатнай маці на такую паслугу.

Апраўдаць сваё нежаданне цяжарыць і нараджаць страхам болю ці сапсавання фігуры немагчыма, прымаюцца пад увагу толькі медыцынскія паказчыкі.

— Пры заключэнні дагавора акрамя абавязковых прапісваюцца і дадатковыя ўмовы. Напрыклад, змена месцажыхарства сурагатнай маці на час цяжарнасці, бо, пэўна, не кожнай жанчыне хочацца тлумачыць суседзям, куды дзеўся яе «цяжарны» жывот. Прадугледжаны дадатковыя выплаты, калі маці раптам спатрэбіцца кесарава сячэнне ці аперацыя, пасля якой нельга будзе захаваць цяжарнасць ці прыйдзецца пазбавіцца нейкай часткі сваёй дзетароднай сістэмы. Заказчыкі таксама аплачваюць адзежу для цяжарных, харчаванне і іншае, — заўважыла **Валянціна СТРЭХ, натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі.**

У выніку набягае кругленькая сума, бо толькі сама паслуга сурагатнага мацярынства (непасрэдна выношванне) каштуе прыкладна 10 000 долараў. А дадайце сюды дадатковыя даплаты і штомесячныя расходы на ўтрыманне маці і кошт працэдуры ЭКА...

У сваю чаргу патэнцыйныя бацькі патрабуюць ад маці не займацца сексам падчас цяжарнасці, каб не справакаваць выкідыш ці нейкія іншыя медыцынскія праблемы. Калі заказчыкі жывуць у іншай краіне, частай умовай становіцца штотыднёвая справаздача сурагатнай маці пра стан здароўя і наведванне ўрачоў.

Сёння — малое, заўтра — грошы

Апладняюць «жывы інкубатар» не толькі ў Мінску, але і ў Санкт-Пецярбургу ці Маскве, аднак выношваць цяжарнасць і нараджаць жанчына павінна ў Беларусі. Нават калі яна не грамадзянка нашай краіны, але мае від на жыхарства. Заказчыкі, у тым ліку і замежныя, перш чым атрымаць права на паслугу сурагатнага мацярынства ў Беларусі, павінны прайсці ў нашай краіне абследаванне, якое пацвердзіць іх немагчымасць мець сваё дзіця. Апраўдаць сваё нежаданне цяжарыць і нараджаць страхам болю ці сапсавання фігуры немагчыма, прымаюцца пад увагу толькі медыцынскія паказчыкі.

Беларускія загсы без праблем рэгіструюць «сурагатнае» дзіця (калі ў Беларусі няма пасольства краіны заказчыка), прычым у раддоме выдаецца даведка на імя генетычных бацькоў, а не парадзіхі, якая павінна ўзяць з сабой на роды дагавор, што пацвярджае яе стан сурагатнай маці. У Расіі, дарэчы, каб зарэгістраваць дзіця на заказчыкаў, трэба атрымаць згоду на гэта сурагатнай маці. Таму расіяне і аддаюць перавагу Беларусі, бо ў гэтым плане адчуваюць большыя юрыдычныя гарантыі на прыналежнасць ім дзіцяці. Немаўля адразу ў радзільні перадаецца генетычнай маці, якая разам з мужам можа прысутнічаць і на родах.

— Бываюць заказчыкі, якія хочуць унесці ў дагавор умову, што пры нараджэнні хворага дзіцяці ці інваліда яны яго не возьмуць. Такое немагчыма прапісаць. Сурагатная маці не можа пакінуць сабе вынашанае дзіця, аднак і генетычныя бацькі павінны абавязкова забраць немаўля і аплаціць паслугі маці. Калі ж дзіця ім не патрэбна, то прыйдзецца аформіць працэдуру адмаўлення ад правоў на малога, — абазначыла натарыус. — З іншага боку, заказчыкі могуць увесці пункт, што маці застанецца без аплаты, калі народзіцца дзіця з венерычным захворваннем, хоць яна ў гэтым можа быць і не вінаватая. Ну як можна даказаць віну, калі жанчына пад кантролем урачоў знаходзіцца? Тым не менш ёй прыходзіцца на гэта пагаджацца.

Дагаворам прадугледжваецца таксама колькасць эмбрыёнаў для апладнення і лік яго спроб. Калі ж яны ўсе няздавальняючыя, сурагатная маці не атрымлівае грошай, а заказчыкі шукаюць іншую жанчыну. Грошы за паслугу выношвання дзіцяці жанчына можа атрымаць толькі пасля яго нараджэння. Колькасць «сурагатных» дзяцей, якіх яна можа нарадзіць, не абмяжоўваецца. Скасаваць дагавор паміж заказчыкамі і маці можна толькі да наступлення цяжарнасці.

Ірына СІДАРОК

■

ДАВЕДКА

Калі з'явіліся на свет двайняты...

Калі гэта першыя дзеці, то выплата складзе 10 БПМ на першае дзіця і 14 БПМ на другое, калі гэта другое і трэцяе дзіця — то выплата складзе па 14 БПМ на кожнага. Таксама ў гэтым выпадку вы маеце права на дадатковую матэрыяльную дапамогу ад дзяржавы.

Дадаткова выплацяць з мясцовага бюджэту па 2 БПМ на кожнае дзіця незалежна ад чарговасці іх нараджэння (Пастанова Саўміна № 985). Такая выплата ажыццяўляецца ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства на падставе прадстаўленых дакументаў — пашпарта і пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей.

Таксама майце на ўвазе, што бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця ў рамках дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі прызначаецца без уліку сукупнага даходу сям'і.

ЯК АТРЫМАЦЬ ДАПАМОГУ Ў СУВЯЗІ З НАРАДЖЭННЕМ ДЗІЦЯЦІ

З'ЯЎЛЕННЕ дзіцяці ў сям'і — і радасць, і вялікая адказнасць. Не забудзьцеся атрымаць дапамогу, якую выплачвае дзяржава ў такіх выпадках!
Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці — гэта аднаразовая выплата, якая прызначаецца і выплачваецца на кожнае дзіця не толькі пры нараджэнні, але і пры ўсынаўленні (удачарэнні). Яе памер складае на першае дзіця — 10 бюджэтаў пражыткавага мінімуму (далей — БПМ), які дзейнічае на дату нараджэння дзіцяці; на другое і наступных дзяцей — 14 БПМ.
Пра тое, якія дакументы і куды неабходна прадставіць, нам расказала начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вера ЛАБКОВІЧ.

Хто мае права на дапамогу?

Права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці маюць маці альбо бацька — у поўнай сям'і; той з бацькоў, хто даглядае за дзіцем, — у няпоўнай сям'і; асоба, якая ўсынавіла дзіця ва ўзросце да 6 месяцаў альбо была прызначана апекуном дзіцяці ва ўзросце да 6 месяцаў.

У поўнай сям'і для прызначэння гэтага віду дзяржаўнай дапамогі хоць бы ў аднаго з бацькоў павінна быць права на яе на дату нараджэння (усынаўлення) дзіцяці.

Калі ў поўнай сям'і адзін з бацькоў (усынавіцеляў) — грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае ў Беларусі, права на гэтую дзяржаўную дапамогу сям'я мае (пры выкананні іншых умоў, устаноўленых заканадаўствам).

Калі ў поўнай сям'і абодва бацькі — іншаземцы, то дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці можа быць прызначана, калі хоць бы адзін з бацькоў на дату нараджэння дзіцяці:

— быў зарэгістраваны па месцы жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

— альбо меў статус часова пражываючага ў Рэспубліцы Беларусь (пры наяўнасці маркі «Дазвол на часовае пражыванне» або «Дазвол на часовае знаходжанне») і пры гэтым падлягаў дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню (быў у працоўных адносінах або ажыццяўляў іншыя віды дзейнасці).

Пры гэтым іншаземцам, якія часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці прызначаецца пры ўмове выплаты абавязковых страхавых унёскаў на сацыяльнае страхаванне не менш за 6 месяцаў увогуле да дня нараджэння дзіцяці. Названая ўмова не ўжываецца ў дачыненні да бежанцаў і асоб, якія атрымалі прытулак у Рэспубліцы Беларусь.

Днём узнікнення права на дапамогу з'яўляецца дзень нараджэння дзіцяці.

Майце на ўвазе: пры звароце па згаданую дапамогу па заканчэнні 6 месяцаў з дня нараджэння дзіцяці яна не будзе прызначана. Таксама згаданая дапамога не прызначаецца сурагатным маці і ў выпадку, калі маці пакінула дзіця ў радзільным доме, а таксама ў выпадках адмовы ад дзіцяці, адабрання дзіцяці, нараджэння мёртвага дзіцяці.

Якія дакументы і куды трэба падаваць?

Асобы, якія з'яўляюцца ІП, натарыусамі, адвакатамі, рамеснікамі, а таксама асобы, што працуюць у мікраарганізацыях колькасцю да 15 чалавек, альбо з'яўляюцца беспрацоўнымі ў няпоўнай сям'і, падаюць неабходныя дакументы ў раённае (гарадское) упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Усе астатнія атрымліваюць дапамогу па месцы працы (вучобы, службы). Калі маці ў поўнай сям'і беспрацоўная, то яна атрымлівае дапамогу па месцы працы мужа.

Неабходны наступныя дакументы:

заява;

пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу;

даведка аб нараджэнні дзіцяці — у выпадку, калі дзіця нарадзілася ў Беларусі;

пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці — у выпадку, калі дзіця нарадзілася за межамі Беларусі;

пасведчанне аб нараджэнні, смерці дзяцей, у тым ліку старэйшых за 18 гадоў (прадстаўляюцца на ўсіх дзяцей);

копія рашэння суда аб усынаўленні (удачарэнні) — для сем'яў, якія ўсынавілі (удачарылі) дзяцей;

выпіскі (копіі) з працоўных кніжак бацькоў (усынавіцеляў, удачарыцеляў), апекуноў ці іншыя дакументы, якія пацвярджаюць іх занятасць, — у выпадку неабходнасці вызначэння месца прызначэння дапамогі;

копія рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа аб устанаўленні апекі (папячыцельства) — для асоб, назначаных апекунамі (папячыцелямі) дзіцяці;

копія рашэння суда аб скасаванні шлюбу або пасведчанне аб скасаванні шлюбу ці іншы дакумент, які пацвярджае катэгорыю няпоўнай сям'і, — для няпоўных сем'яў;

пасведчанне аб заключэнні шлюбу — у выпадку, калі вы знаходзіцеся ў шлюбе.

Акрамя таго, для назначэння дапамогі раённае (гарадское) упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне самастойна запытае наступныя дакументы:

даведку аб месцы жыхарства і складзе сям'і або копію асабовага рахунку;

дакументы або звесткі, якія пацвярджаюць неатрыманне аналагічнай дапамогі за межамі Беларусі, — для поўных сем'яў, у якіх адзін з бацькоў пастаянна пражывае на тэрыторыі дзяржавы, з якой нашай краінай заключаны міжнародныя дагаворы, двухбаковыя пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнай абароны.

Тэрміны разгляду заявы

10 дзён з дня падачы заявы, а ў выпадку запыту дакументаў і (або) звестак ад іншых дзяржаўных органаў, іншых арганізацый — 1 месяц.

Святлана БУСЬКО.

УСМЕШКІ НАШЫХ ЗАЙЧЫКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Цяжка перадаць, што перажывае жанчына, калі яна даведваецца пра такі дыягназ. І тут многае залежыць ад персаналу, які займаецца дыягностыкай цяжарных. Адна справа, калі ўрач скажа: «Так бывае, нічога страшнага», і зусім іншая, калі выпаліць: «Які жах!» Будучым мамачкам яшчэ даношваць дзіця, і важна, каб яны былі спакойныя. Але часта мы заўважаем, што ў медыкаў не хапае інфармацыі пра дзетак з расколінамі губы і паднябення і іх лячэнне. З такой жа неадукаванасцю можна сутыкнуцца і ў радзільных дамах. Наколькі складана прыходзіцца там жанчыне, калі яна загадзя не ведала пра тое, якое ў яе народзіцца дзіця, і пра праблему чуе толькі ад акушэркі, і добра, калі гэта не словы грэбавання і знявагі, — заўважае **адна з аўтарак праекта «Усмешкі нашых зайчыкаў» Наталля МАСЮК.**

Адна з задач, якую ўзялі на сябе актыўныя мамачкі, дзеткі якіх нарадзіліся са сківічна-тварнай паталогіяй, — распаўсюджванне інфармацыі пра такую праблему. Бацькі аб'ядналіся, каб разам шукаць адказы на пытанні і падтрымліваць тых, хто толькі даведваецца пра падобны дыягназ. Далучыцца да суполкі можна з любога пункта Беларусі. Толькі за год праз групы ў «Вайберы» і «УКантакце» прайшло больш за 150 чалавек. Хтосьці звяртаецца па кансультацыі, іншыя шукаюць падтрымкі, для некага важна бачыць, што ён не адзінокі ў такой бядзе. Тут можна спытацца, як рыхтавацца да аперацыі і што ўзяць з сабой у бальніцу, даведацца пра карысныя вынаходніцтвы мам, убачыць, як можна займацца з малымі. І валанцёрская справа не абмяжоўваецца віртуальнымі кансультацыямі — людзі сустракаюцца, многія гатовыя выехаць з візітам падтрымкі цэлымі сем'ямі і расказаць, як яны змагаліся з «непрыгожым» дыягназам, паказаць, што сёння ўсё ў іх нармальна, падзяліцца, колькі радасці бацькі атрымліваюць, гадуючы асаблівых дзетак.

Часам у суполку паступаюць сігналы SOS. «Ратуйце майго пляменніка!» — прасіла жанчына, калі ў яе швагеркі на 21-м тыдні цяжарнасці выявілі, што хлопчык можа нарадзіцца з расколінай, і далі накіраванне на перарыванне цяжарнасці. Між іншым, менавіта дзякуючы вопыту і парадам «бывалых» ужо ўдалося захаваць некалькі жыццяў — будучых мамачак адгаварылі ад абортаў, падказалі, да якіх урачоў звярнуцца па кансультацыю, і нават распісалі план дзенняў пры нараджэнні асаблівых дзетак. Часам ініцыятыву праяўляюць і таты. Так, у адной з пінскіх сем'яў, дзе павінна было нарадзіцца дзіця з расколінай, мама чытала форум, але на кантакт не ішла, затое будучы тата ўпэўнена заяўляў: «Тэма аборту ў нас табу. Мы нашу дзяўчынку вельмі чакаем!»

З Салігорска на старонку «Усмешкі нашых зайчыкаў» звярнулася дзяўчына, якая сутыкнулася з праблемамі ў радзільным доме. Як правіла, малых з расколінамі мамачкам доўга не аддаюць: такія дзеткі не могуць есці, і накарміць іх — вялікая праблема. Але ізалюючы немаўлят і перакладваючы ўвесь клопат за іх на медперсанал, парадзіх пазбаўляюць магчымасці набрацца каштоўнага вопыту. «Гэта я, як мама, павінна навучыцца карміць і даглядаць свайго малога, а мне давялося некалькі дзён хадзіць, выпрошваць, каб аддалі дзіця, — заўважае Наталля. — Падчас цяжарнасці ў мяне не дыягнаставалі, што малое народзіцца з расколінай, і я мітусліва шукала выйсце. Добра, што ёсць інтэрнэт, дзе я знайшла інфармацыю пра прыстасаванні для кармлення такіх дзяцей. Яны дарагія (ад 100 рублёў), і раней іх складана было купіць, тавар прывозілі пад заказ, таму я вырашыла параіцца з урачом, што лепш набыць: паільнік Хабермана ці медэлаўскую лыжку. Але аказалася, што ён пра падобныя прыстасаванні нічога не ведаў! Дзяцей з расколінай кормяць праз зонд, але навошта іх мучыць?

Такіх лялек вырабляе адна з мам суполкі «Усмешкі нашых зайчыкаў».

Даводзілася ўпрошваць, каб у цябе ўзялі спецыяльныя прыстасаванні для кармлення, але персанал адмаўляўся імі карыстацца. А калі мне з агідай сказалі: «Купіце цялячую соску», наогул узнікла жаданне схапіць дзіця і збегчы»...

На жаль, на форум «Усмешак...» і сёння звяртаюцца жанчыны з падобнымі гісторыямі, але бацькі, якія ўжо прайшлі ўсе выпрабаванні, заўсёды на сувязі. «Не бойцеся! Не панікуйце! У вас ёсць мы! Усе праблемы вырашальныя!» — заяўляюць мамачкі «зайчыкаў». І хоць на людзях яны падаюцца вельмі моцнымі, спакойнымі, гатовымі пераадолець любыя перашкоды, жанчыны прызнаюцца, што, калі застаюцца сам-насам, часта адчуваюць сябе бездапаможнымі, плачуць, бо страх за дзіця не адпускае. Як яно будзе далей развівацца, ці не ўзнікнуць у яго праблемы са слыхам (часта такія дзеткі хварэюць на атыты), як будзе фарміравацца яго маўленне і як яго ўспрымуць у соцыуме. Якімі б прыгожымі і разумнымі ні сталі такія дзеткі, але калі ў іх будзе «каша ў роце», ці не адб'ецца гэта на ўзаемаадносінах з равеснікамі?

— Сёння пра нашу праблему ніхто не гаворыць. Ці зможаце вы назваць вядомых людзей з расколінай? Усё таму, што грамадства не прымае тых, хто адрозніваецца. Часта людзі вырастаюць з комплексамі. І мы хочам мяняць стаўленне да нашых дзяцей і наогул людзей, якія нарадзіліся з падобнай паталогіяй. Таму мы запрашаем у нашы групы не толькі бацькоў (і цяжарных жанчын) асаблівых дзетак. Крыўдна было, калі адна з дзяўчын, да якой я падышла на вуліцы, на маю прапанову далучыцца да нашай суполкі аднеквалася: «Гэта мяне сабака пакусаў». Жаданне схавацца не дапаможа разабрацца з жорсткімі дражнілкамі і засцерагчы асаблівых людзей ад фарміравання комплексу непаўнавартасці. Мы, наадварот, шукаем асоб з расколінай, гатовых у голас заявіць пра сябе. І нас ужо падтрымаў КВЗ-шнік Дзяніс Дорахаў, пагадзіўся быць нашым «тварам», — расказвае Наталля Масюк.

«Я вырашыла параіцца з урачом, што лепш набыць: паільнік Хабермана ці медэлаўскую лыжку. Але аказалася, што ён пра падобныя прыстасаванні нічога не ведаў!»

Перакройваць адносіны ў грамадстве даволі цяжка. «Прыйшла дадому і плачу», — дзялілася адна з мамачак пасля прагулкі. Яе «зайчык» гуляў у пясочніцы, і адна з жанчын дэманстратыўна забрала адтуль сваё дзіця. «Людзей, якія так сябе паводзяць, трэба зразумець і дараваць», — упэўнена яшчэ адна **мама з суполкі «Усмешкі нашых зайчыкаў» Святлана КУЧКО.** Калі нехта не гатовы спачуваць ці прымаць чужыя праблемы, яму заўсёды прасцей збегчы. У нашым грамадстве доўга прынята было хаваць некаторыя хваробы, бачныя дэфекты, інваліднасць, і людзям яшчэ патрэбен час прызвычаіцца да гэтага. Ды і бацькам асаблівых дзетак таксама неабходна навучыцца так жыць, каб не выдзяляцца ў соцыуме.

А пачынаць трэба заўсёды з сябе, упэўнена Святлана: «Гэта сёння я магу сказаць іншым мамам, у якіх толькі нарадзіліся дзеткі з расколінай, што ўсё будзе добра. Але я ўспамінаю свае слёзы — трэба было знайсці сілы, каб перажыць гэта выпрабаванне, сабрацца, бо, калі вы будзеце нервавацца, не зможаце дапамагчы дзіцяці, сваімі страхамі нашкодзіце яму. Важна проста любіць, малы ўсё адчувае і разумее. Я вельмі люблю сваю дзяўчынку, бачу, якая яна ўпэўненая. І яна з гэтым пойдзе па жыцці»...

Мамы «зайчыкаў» мараць пра ўласны рэабілітацыйны цэнтр, дзе для малых са сківічна-тварнай паталогіяй будуць распрацаваныя комплексныя праграмы.

На жаль, сёння спецыялістаў, якія б займаліся з такімі малымі, моцна не хапае. Так, у Беларусі працуюць выдатныя хірургі — гледзячы на іх былых пацыентаў, нават і не здагадаешся, што малыя нараджаліся «не такімі». Але аперацыі, якая прыбярэ дэфект з тварыка дзіцяці, недастаткова: у «дадатак» да такой знешнасці ідуць парушэнні функцый глытання, дыхання, маўлення. Наогул, некаторым дзеткам давядзецца перанесці не адну аперацыю. Вельмі патрэбна дапамога артадонтаў, лагапедаў, оталарынголагаў, неўролагаў, псіхолагаў. А паспрабуй яшчэ знайдзі таго ж дэфектолага, які ведае, як працаваць з дзеткамі з такой паталогіяй. Часта кваліфікаваная дапамога выліваецца ў сур'ёзныя сумы (напрыклад, сеанс логамасажу можа каштаваць каля 25 рублёў). Сем'ям з рэгіёнаў, акрамя таго, што яны мусяць плаціць за медыцынскія паслугі, трэба знаходзіць грошы на дарогу ў сталіцу. А колькі каштоўнага часу губляецца на пошук спецыялістаў і неабходнай інфармацыі!

У планах актыўных мамачак «зайчыкаў» стварыць грамадскае аб'яднанне, ладзіць выязныя прыёмныя па абласных і раённых цэнтрах разам са спецыялістамі (многія медыкі гатовы іх падтрымаць), дзе малыя і іх бацькі, а таксама цяжарныя жанчыны, якія ўжо ведаюць пра такі дыягназ, змогуць атрымаць кваліфікаваную дапамогу і кансультацыі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

■ Сямейны доктар

ЛЕКІ, ЯКІЯ НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ

Што варта ўзяць з сабой на адпачынак

Каб не сапсаваць сваё знаходжанне на адпачынку, важна ўзяць з сабой аптэчку, асабліва калі падарожнічаеце з дзіцем. Малыя горш за дарослых пераносяць змену клімату, іх капрызныя жывоцікі могуць не прыняць новую ежу, а бурная радасць ад новых мясцін нярэдка абарочваецца сінякамі ды ранкамі... Ды і ці мала што яшчэ можа здарыцца? Як сустрэць такія непрыемнасці ў поўным узбраенні, расказала загадчыца 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі горада Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.

— На адпачынку у бацькоў павінны быць пад рукой некалькі відаў прэпаратаў. Сярод іх сонцаахоўныя крэмы, антысептыкі і перавязачны матэрыял, гарачкапаніжальныя, супрацьалергічныя сродкі і лекі ад расстройства страўніка, — нагадвае Людміла Іванаўна.

Каб пазбегнуць апёкаў і для аховы скуры ад ультрафіялету, купіце **сонцаахоўны крэм не менш за 30 SPF.** Памятайце, што час знаходжання пад сонцам не павінен перавышаць дзвюх гадзін, прычым толькі ў ранішнюю і вячэрнюю пару. У перыяд з 11 да 15 гадзін загараць не рэкамендуецца ні дзецям, ні дарослым. Калі скура пачырванела, неабходна наносіць **пантэнол-спрэй** ці **бепантэн-крэм.**

У выпадках парэзаў, ранак спатрэбяцца **пераkіс вадароду, лейкапластыр, вата і бінт.** Можна дадаць яшчэ і **зялёнку.**

Калі ў дзіцяці павысілася тэмпература ад знаходжання на сонцы ці вострай рэспіраторнай інфекцыі, выручыць **парацэтамол.**

У выпадку дыярэі, выклікаў як змяненнем харчовага рацыёну, так і кішэчнай інфекцыяй, дапаможа **актываваны вугаль** ці **смекта.** Маючы на ўвазе кішэчную інфекцыю, якая нярэдка ўзнікае ад няякаснай ежы ці вады, захапіце з сабой **ніфураксазід (стопдыяр).** Ні ў якім разе не бярыце лаперамід (ён добра спыняе дыярэю, але ў выпадку, калі яна носіць інфекцыйны характар, толькі нашкодзіць).

Калі ў дзіцяці з'явяцца алергічныя рэакцыі — на ўкусы насякомых, ад ужывання новых харчовых прадуктаў і інш., варта скарыстацца **фенкаролам.** Калі едзеце з дзецьмі, у якіх алергічная рэакцыя можа працякаць у выглядзе цяжкасці дыхання, звязанай з ацёкам дыхальных шляхоў, вазьміце з сабой **будзесанід** у выглядзе спрэю (але для яго набыцця неабходны рэцэпт, таму загадзя звярніцеся да свайго педыятра).

— Выязджаючы ў краіны, дзе ёсць высокая верагоднасць захварэць той ці іншай інфекцыяй, напрыклад адром, клешчавым энцэфалітам, вірусным гепатытам, малярыяй, неабходна ад іх прышчапіцца, — адзначае Людміла Кіпцэвіч. — Але пра гэта трэба паклапаціцца загадзя, прыкладна за месяц, бо імунітэт пасля прышчэпкі выпрацоўваецца да некалькіх тыдняў. Звяртацца варта ў тэрытарыяльны Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі і, высветліўшы эпідэміялагічную сітуацыю ў той краіне, дзе вы плануеце адпачынак, удакладніць усю інфармацыю аб вакцынацыі.

На адпачынку у бацькоў павінны быць пад рукой некалькі відаў прэпаратаў. Сярод іх сонцаахоўныя крэмы, антысептыкі і перавязачны матэрыял, гарачкапаніжальныя, супрацьалергічныя сродкі і лекі ад расстройства страўніка.

Алена КРАВЕЦ

■

«ДА НАС ПРЫПЯЦЬ СТУКАЕ Ў ПАРОГ»

Татавы дочкі.

«У 18 ГАДОЎ Я МЕЛА ПЛАН...»

Здаецца, што можа з'яднаць у сямейную пару гараджанку з Віцебска і хлопца, які ўсё маленства правёў у маленькай палескай вёсачцы?

— Муж адразу ўразіў сваім характарам, — успамінае Марына. — На лета я прыязджала да бабулі і там заўважыла незвычайнага хлопца. Бацькі рассталіся, калі ён быў яшчэ дзіцем, і гэта наклала свой адбітак. У тыя часы нельга было пражыць без гаспадаркі, таму Рыгор з маленства дапамагаў маці, умеў касіць, араць. Пры гэтым быў добры, уважлівы і адказны, марыў стварыць і захаваць сям'ю. Аднагодкі не ішлі з ім у параўнанне — яны здаваліся спешчанымі хлопцамі з ветрам у галаве. А ў мяне ўжо ў васьмнаццаць гадоў быў план, якой хачу бачыць будучую сям'ю.

— Не баяліся выходзіць замуж так рана?

— Думаю, для гэтага нельга быць занадта маладым альбо старым. Ёсць людзі, якія і пасля 30 не ўсведамляюць, што без клопату пра каханага пабудаваць адносіны немагчыма. Калі ты вырашаеш упусціць у асабістую прастору іншага чалавека, табе давядзецца прыслухоўвацца да яго меркавання. Асабістае «я» сыходзіць на другі план, саступаючы «мы». Кахаць — гэта паважаць, цаніць, быць уважлівым адно да аднаго. Калі мы з Рыгорам пачалі сустракацца і расказваць пра сябе, то зразумелі, што маем падобныя погляды.

— Няўжо на спатканнях вы садзіліся побач і пачыналі абмяркоўваць сумеснае жыццё гадоў на 10—20 наперад?

— Мы і цяпер садзімся побач, каб параіцца пра будучыню. Хоць быў перыяд рамантыкі, калі Рыгор мог патэлефанаваць у Віцебск, каб праспяваць песню пад гітару. Я думаю, сям'і неабходна шчырасць — калі не баішся выказаць партнёру што добра, а што не падабаецца. Безумоўна, можна маўчаць, па-пакутніцку закочваць вочы, але тады замест сям'і атрымаем серыю з «мыльнай оперы», дзе героі накручваюць драму на пустым месцы. Можа быць, твая палавінка не ўяўляе нават, што ты лічыш нейкі ўчынак крыўдным, і, калі шчыра расказаць пра свае перажыванні, любімы чалавек пастараецца больш не рабіць балюча.

— Вам ніколі не даводзілася спрачацца?

— Нам з мужам нельга, — смяецца Марына. — Калі дзеці чуюць, што нехта з нас павышае голас, адразу прыбягаюць: «Ой, а чаму вы тут крычыце?» Воляй-няволяй стараешся пры любой спрэчцы прыйсці да кампрамісу. Так, напрыклад, было, калі выбіралі імя для малодшай дачкі — усе сямейнікі сабраліся на «галасаванне».

Пакуль рыхтаваўся матэрыял, Міхаліна і Злата паспелі паўдзельнічаць у конкурсе «Еўраюрмала-2018» у Латвіі і прывезлі адтуль першае і другое месцы.

«ЗАЛАТАЯ» СЦЯНА

Артур, Міхаліна, Злаціслава... Дзіўным чынам імёны дзяцей сталі падказкай для іх будучыні і характару. Так, старэйшы сын нарадзіўся даволі маленькім, і бацькі вырашылі назваць дзіця іменем легендарнага караля-рыцара. Хлопец вырас, пасталеў і цяпер служыць у акадэміі МУС. Другая дачка Міхаліна стала доўгачаканай, яна нарадзілася праз восем гадоў пасля брата і стала сапраўдным «Божым дарам». Таленавітая дзяўчынка выступае ў самых розных музычных конкурсах. Яе прыклад пераймае малодшая дачушка Злаціслава. Маленькая артыстка пакуль што ходзіць у першы клас, але таксама любіць выступаць на сцэне. У дзіцячым пакоі адна сцяна спрэс завешана медалямі і дыпломамі. Дзяўчаткі жартуюць, што «сцяна гонару» яшчэ не поўная, бо ў шуфлядах хаваюцца ўзнагароды, для якіх не хапіла месца.

— У якіх вобразах даводзілася выступаць? — пытаюся ў Міхаліны.

— Ва ўсіх, — крыху падумаўшы, сур'ёзна адказвае дзяўчынка. Яна штомесяц удзельнічае ў музычных фестывалях і конкурсах, спявае на раённых і гарадскіх святах і не так даўно аказалася вылучана ад раёна на Прэзідэнцкую прэмію.

— Міхаліна спявае ў розных жанрах. Музычны педагог працуе над пастаноўкай голасу і над вакалам, а я, атрымліваецца, выконваю абавязкі касцюмера, грымёра і рэжысёра-пастаноўшчыка нумароў. Гэта вельмі дзіўна, бо ў дзяцінстве марыла працаваць з адзеннем, пастаянна шыла абноўкі лялькам і вось — прыдумляю вобразы для дачкі, — прызнаецца Марына. — Здаецца, колькі нумароў мы ўжо адпрацавалі, але кожны раз, калі дочкі выступаюць, заўсёды стаю за кулісамі, бо пастаянна перажываю і хвалююся за іх, як і настаўніца Яўгенія Ткачук.

Для ўзнагарод з фестываляў і музычных спаборніцтваў ёсць свая «варта» — шытыя лялькі, якія Міхаліна майструе разам з мамай і малодшай сястрой. Тут і барадаты абаяльны Зюзя, і Васіліса з сінімі валасамі, якая мела сваю ролю ў выступленні на конкурсе «Сям'я года — 2017». Дарэчы, дагэтуль тры папярэднія гады прадстаўнікам Брэсцкай вобласці не ўдавалася ўзяць прызавое месца ў конкурсе.

— Рыгор добры па натуры. Вось аднойчы пайшоў па справах у гарвыканкам, а там прыкінулі, што наша сям'я быццам бы падыходзіць пад конкурсныя параметры, і перадалі яму палажэнне аб удзеле. Памятаю, як тэлефануе мне: «Марына, тут палажэнне аб сямейным конкурсе ўручылі. Давай зробім пару фотаздымкаў, адксерым некалькі дыпломаў і перашлём». Гэта пасля, як ён прыйшоў дамоў і мы пачалі чытаць патрабаванні, валасы на галаве заварушыліся — столькі ўмоў трэба выканаць! Я нават папрасіла мужа занесці гэтыя паперы назад, бо здавалася, што не зможам. Аднак сабраліся, падумалі і вырашылі: трэба паспрабаваць. Не сказаць, што шлях да фіналу аказаўся лёгкі. Дапамагалі кураторы з Лунінца, мікашэвіцкі рэжысёр Валянціна Шэўчык і дырэктар Цэнтра дзіцячай творчасці Алена Саўчук, але большую частку работы рыхтавалі самастойна.

АД ЛІРНІКАЎ ДА ПРЫБЛІЖАНЫХ ЦАРА

— На заданні «Радавод» вы адзіныя зладзілі выступленне на беларускай мове, ды яшчэ разыгралі перад гледачамі побытавую сцэнку з краснамі і бабулінымі песнямі. Гэта конкурс паспрыяў даследаванню сямейнага дрэва?

— Мой бацька яшчэ гадоў дзесяць назад зацікавіўся гісторыяй роду і пачаў праглядаць архівы. Памятаю, як ён паўтараў: «Марынка, я тут таго-сяго «накапаў», ты не паверыш, але ў нас ВЕЛЬМІ глыбокія карані!» Хоць мне на той час было не да даследаванняў — маленькая дачка, «пялюшкавыя» клопаты... Але ў памяці словы бацькі адклаліся і потым прыдаліся да справы. Мужавы старэйшыя родзічы таксама цікавіліся радаводам, ездзілі ў архівы ў Мінску, дзе высветлілі гісторыю роду дакладна да XVIII стагоддзя. Атрымліваецца, нашы дзеці — дзясятае пакаленне.

«Муж ад самага пачатку не хацеў поўнасцю перабірацца на «каменныя паверхі». Ён многае прывык рабіць сваімі рукамі».

— У гісторыі продкаў што вас зацікавіла больш за ўсё?

— Паходжанне нашых прозвішчаў. Хвясюк, як аказалася, слова вельмі старое, звязанае з гісторыяй старажытных часоў. Калісьці яно было распаўсюджана сярод вандроўных музыкаў-лірнікаў, засталіся згадкі, быццам бы гэта было адно з іх бостваў. Самае дзіўнае, але ў мужавай сям'і сапраўды многія з цягай да музыкі і спеўным дарам ад прыроды, ды і нашы дачушкі маюць пакліканне да спеваў. Што датычыцца «жаночай» лініі, то маё дзявочае прозвішча Будзішэўская. Кажуць, яно пайшло з часоў Івана Жахлівага і прызначалася людзям, якія былі набліжаныя да цара — альбо родзічамі, альбо тым, што знаходзіліся ў свіце.

— Падаецца, з такой гісторыяй роду не вельмі вяжуцца кроснаў...

— Наадварот, для нашай сям'і гэта звыклы прадмет. Дзед Рыгора лічыўся заможным чалавекам, меў сялібу і нават здаваў у арэнду гліняны кар'ер на сваёй зямлі. А каб усяго гэтага дабіцца, даводзілася працаваць. Потым вясковае жыццё таксама не адпускала далёка ад традыцый. Ну а я, хоць і жыла ў горадзе, кожныя вялікія канікулы прыязджала на Палессе да бабулі. Яны з дзедам трымалі вялікую гаспадарку: куры, свінні, авечкі, каровы, конь. А яшчэ ў іх доме заўсёды ткалі. Памятаю, расказвалі, што кросны калісьці зрабіў сваімі рукамі дзед са спецыяльна выпісанай драўніны, вось і атрымаліся яны масіўныя, надзейныя. У сабраным стане займалі, бадай, усё месца ў хаце, так што дарослыя ссоўвалі мэблю да сцен. На намотку нітак збіралася ўся вуліца, і бабуля пастаянна буркацела, каб я «барані Божа» нічога ў гэтай намотцы не зрушыла і не пераблытала. Але ж вядома: што нельга, тое і цікава, дык я рознымі хітрыкамі прабіралася ў пакой і назірала за работай, запамінала, куды якія ніткі прымацоўваць. Цяпер прыгадваю, што ў кожнай вёсцы быў свой арнамент, быццам бы і падобны на той, што ў суседзяў, але ў нечым адрозны.

У КРАІ БУСЛОЎ

Нягледзячы на тое, што цяпер сям'я жыве ў кватэры, Рыгор не пакінуў мары адрадзіць вясковы дамок. Больш за тое, «заразіў» ёю сямейнікаў.

— Муж ад самага пачатку не хацеў поўнасцю перабірацца на «каменныя паверхі». Ён многае прывык рабіць сваімі рукамі — можа і сена накасіць, і дом пабудаваць. Не дзіва, што дзеці сталі пераймаць навуку быць гаспадарамі. Дамок, які застаўся Рыгору ад маці, літаральна «ў зямлю ўрос». Затое побач стаяў цалкам прыдатны цагляны хлеўчык. Нам ён падаваўся даволі надзейным. Вырашылі параіцца з лунінецкім архітэктарам, бо патрэбны былі дакументы на рэканструкцыю, той доўга аднекваўся, але мы дамагліся свайго. А жаданне рэканструяваць пабудову было, ды яшчэ якое! Да першапачатковых сцен дабудавалі другі паверх, тэрасу і цяпер кожнае лета выязджаем на прыроду, наводзім апошні лоск. Дарэчы, калі вялікая рака разліваецца, вада стаіць каля самага парога.

Дзікая «прырода» пры блізкім знаёмстве аказалася не такой ужо і палахлівай. Пра свае незвычайныя сустрэчы Міхаліна і Злаціслава расказваюць захоплена. Далёка бацькі не дазваляюць хадзіць, але і побач з хатай багата ўражанняў — трава па плечы, жабы, цвыркуны... Прыходзяць і буйныя госці: зайцы, лісы, ласі.

— Калі прыязджаем у вёску, то мне асабліва цікава назіраць за жабамі — як яны «спяваюць», але як толькі праляціць над галавою бусел, то ў стаўку адразу поўная цішыня, — дзеліцца ўражаннямі Міхаліна. — Буслоў побач жыве мноства, птушкі літаральна на кожнай хаце і на кожным слупе. Падабаецца назіраць, як летам у кожным гняздзе бацькоў чакаюць птушаняты.

— Пару гадоў назад пасадзілі саджанцы дрэў, а абвязаць стволікі забыліся. Дык што вы думаеце — зайцы іх тут жа аб'елі! — далучаецца да ўспамінаў Марына. — А то яшчэ муж вырашыў выкапаць на ўчастку невялікую сажалку. З часам яе берагі густа зараслі вербалозам і мокрую мясціну ўпадабалі бабры. Перабраліся да нас з суседняй рэчкі і збудавалі побач з чалавечым жытлом уласную плаціну. Рыгор потым спецыяльна нас вадзіў і паказваў, як вакол вады дрэвы абгрызены, нібы алоўкі.

* * *

Некаторыя людзі скажуць, што дзеці дабаўляюць клопатаў. Магчыма, яно і так, але, развіваючыся з Рыгорам, Марынай і дзяўчаткамі, злавіла сябе на думцы, як гарманічна яны дапаўняюць адно аднаго: тата і мама вучаць малых павазе да продкаў і мясцін, дзе яны ўсе нарадзіліся, а дзеці пастаянна рухаюцца да новых вяршыняў і не даюць дарослым застываць у побытавых клопатах.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

ТЭКСТ, НАПІСАНЫ Ў НЯДЗЕЛЬКУ

Усё пачалося ў пятніцу вечарам. А вы ж ведаеце, што калі нешта пачынаецца ў пятніцу вечарам, яно можа мець незвычайны працяг.

У пятніцу вечарам добра даць хоць які адпачынак вачам, стомленым за тыдзень чытанняў-пісанняў. Ці не так? Але чарговы раз на мае вочы трапіла «выкапіроўка з плана Гродна 1780 года», якая існуе ў адкрытым доступе па меншай меры ў двух варыянтах — падрабязная, але не вельмі выразная, і выразная, але не вельмі падрабязная. І першая, і другая, калі табе трэба нешта ўбачыць дакладна, нервуюць і раздражняюць. (З іншага боку, хіба мы не ведаем, як часта нешта важнае прыходзіць у імгненні не надта пазітыўныя, а то і ўвогуле безнадзейныя?)

Занурыўшыся ў схему Гарадніцы, я ўпарта шукала адказ на пытанне, дзе тут мог жыць Жылібер, хоць мне ўжо гісторыкі медыцыны адказвалі: «Невядома». Але недзе ж ён, прафесар з Францыі, заснавальнік медыцынскай школы і батанічнага саду, мусіў жыць. Болей за тое, не можа так быць, каб дом такой асобы быў настолькі незаўважны, што не трапіў на план! І вось як людзі, бывае, чытаюць паміж радкоў, так я чытала паміж квадратаў і прамавугольнікаў — палацаў, флігеляў, афіцын, пякарняў, корчмаў, аранжарэй і майстэрняў. Гэта было марным клопатам, але інтарэс не знікаў.

Перш чым здзяйсняць вандроўкі па краіне, мы здзяйсняем іх у часе з дапамогай дзённікаў розных гістарычных асоб. Таму добра ведаем, што 20 верасня 1778 года, у нядзельку па абедзе, у Гродна ўехаў экіпаж астранома і прыродазнаўцы Іагана Бернулі. Ганаровы член Пецярбургскай акадэміі навук, ён ехаў якраз з Пецярбурга. Меў пры сабе ліст ад начальніка ковенскай пошты да гродзенскага бурмістра, а той прапанаваў пазнаёміцца з тутэйшым прафесарам. «Гэты ладна складзены вучоны француз так ветліва і шчыра запрашаў нас закватараваць у сваім доме, што нельга было адмовіць», — запісаў Іаган Бернулі ў падарожным нататніку вечарам таго ж дня. Хай бы ён напісаў хоць трошачкі больш падрабязна: што за дом, дзе стаіць, да чаго павернуты ўваходам...

Зрэшты, перамагае той, хто не здаецца. Праз яшчэ некалькі гадзін упартых узіранняў у схему ў тую ж самую пятніцу вечарам я ўжо ведала, дзе з 1775 да 1781 года жыў у Гродне наш Жылібер. І як я раней не здагадвалася?..

Адзначыць адкрыццё захацелася неадкладна — і вось у суботу мы ў Гродне, а паколькі дом Жылібера ёсць на схеме, але не існуе ўжо ў рэальнасці, адзінае месца, прыдатнае для вандроўкі (прынамсі, там можна адчуць дух адпаведнай навукі і патрэбнага часу), — гэта аптэка-музей. Варта сказаць, што злучок паміж гэтымі словамі змяшчае амаль тры стагоддзі: аптэка існуе з 1709-га, музей быў заснаваны ў яе сценах праз 287 гадоў. Лічбы ўражваюць.

Сцены таксама. Па-першае, завяршаюцца крыжавымі скляпеннямі, што і не дзіўна для старога манастыра, часткай якога была аптэка (кажуць, што нават яшчэ ў сярэдзіне XX стагоддзя скляпенні ўпрыгожвалі фрэскі, нанесеныя езуітамі). Па-другое, гэта ў іх здабываліся лекі

«Какторый».

з раслін, сабраных прафесарам Жылібералм і яго студэнтамі. Найбліжэйшы ад уваходу фрагмент экспазіцыі пад назвай «Какторый» дэманструе розныя тыпы нажоў, разакоў, цесакоў, млыночкаў і гільяцінак: кажнай лекавай раслінцы — сваё, так бы мовіць, лязо. І свая скрыня для захоўвання, з персанальным подпісам: Millefolium, Viola tricolor, Euphorbia, Erigeron... — крываўнікі, трохколерныя браткі, малачаі, купалкі... Гэты драўляны стэлаж з падпісанымі скрынямі — добры спосаб паўтарэння лацінкі, а заадно трэніроўкі зрокавай памяці, далібог. Асабліва калі ты падарожнік, які прынцыпова не фатаграфуе ўбачанае — каб захавалася ў сэрцы і памяці. Здаецца, там былі яшчэ скрыні для трыпутнікаў, мальваў, мыльнікаў...

Побач — процьма самых розных ступак і колбачак — для ператварэння сечаных травак у пульверысы і цінктуры. Але вока хутка перахоплівае вялікі шар-сасуд з сіняга шкла. Наяўнасць у вітрыне такога шара (не абавязкова ён быў сіні — мог быць яшчэ зялёны, жоўты або чырвоны — колер сімвалізаваў адну з чатырох стыхій) стварала аптэцы прэстыж і гонар. Кажуць, гэтыя шары-эмблемы каштавалі так дорага, што некаторыя не вельмі паспяховыя аптэкары ўлівалі ў звычайную бясколерную колбу падфарбаванай вады. Наша аптэка-музей у Гродне відавочна паспяховая — сіні шар у яе вітрыне сапраўдны, а не падробка, — зроблены з кобальтавага шкла. Ці не самая дарагая рэч сярод дзвюх тысяч рарытэтаў, ён паходзіць з Лондана сярэдзіны XIX стагоддзя.

Дарэчы, пра фарбаванне. Аптэка раней была месцам продажу не толькі лекаў. Тут гандлявалі і рознымі натуральнымі фарбамі. Іх тут увогуле выраблялі. Значная частка мясцовых раслін, якія Жылібер апісаў у кнізе «Флора Літвы», абавязана была служыць сыравінай для арганізаванай Тызенгаўзам тэкстыльнай вытворчасці. З кампанулы, або званочкаў, атрымлівалася чырвоная фарба для мануфактур. Трэба было толькі вылучыць з іх ртуць. Але «месье Жылібер з фунта расліны Campanula latifolia odorans (якой існуе два віды) здабывае чатыры унцыі ртуці», — запісаў у нататніку Іаган Бернулі. Тызенгаўз каго хочаш мог прымусіць здабыць што заўгодна... Некаму падаецца, што з Жылібералм яны сябравалі. Маглі, канешне. Жылібер нават збіраўся прысвяціць спадару Антонію «Флору Літвы». Але перадумаў і прысвяціў каралю, у гонар якога назваў і свайго сына, які нарадзіўся тут, у Гродне, у 1780-м. Не можа быць, каб маленькі Станіслаў зусім ні на што не хварэў і яму не давалі лекі вось з гэтай аптэкі. Напрыклад, кроплі дацкага караля — з лакрыцай, кропавай вадой і анісавым алеем.

Перад вайной, ужо ў блізкі нам час, тут гаспадарыў Эдвард Стэмпнеўскі. Пры ім у аптэцы пачалі газіраваць мінеральную ваду. Увогуле, ён шмат што зрабіў для аптэкі і горада, будучы і прэзідэнтам яго, і адным з арганізатараў таварыства аматараў мастацтва, і сябрам Элізы Ажэшкі, і дабрачынцам. Ён і цяпер прымае ўдзел у справах аптэкі: злева ад экспедыцыйнага стала, адразу за шафай-вітрынай, абстаўленай штанглазамі і парцэлянкамі, можна заўважыць кій і цыліндр пана Эдварда. Можа, ён сядзіць цяпер за канторкай, вядзе падлік эфіру, бергамотнага алею і памаранцавых кветак, што разышліся для кёльнскай вады, а потым паволі ўстане, разагне спіну, выйдзе з-за канторкі, возьме ў руку кій, пакрые галаву цыліндрам і пойдзе павольна па вуліцы, разглядаючы новы Гродна.

Жылібера тут таксама можна бачыць. Дакладней, выяву яго бюста работы невядомага аўтара. Углядаючыся ў звернутую набок галаву над відавочнай сутуласцю і трохі перакошаны твар, згадваеш словы Бернулі пра «ладна складзенага француза» — і думаеш: гэта ў Гродне ў свае трыццаць сем ён выглядаў ладна складзеным, а калі вярнуўся ў Францыю, жыццё яго пакруціла...

Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.

Выява аптэкі часоў езуітаў.

Рамантыкам

З сярэдзіны XIX стагоддзя тут, пры аптэцы, існавала яшчэ і кандытарская. Можна думаць, што гэта ў ёй пан Канстанты Відацкі, айчым будучай Элізы Ажэшкі, набываў цукеркі для малой Зюні і яе сястры Клемянтынкі. Не ведаю, што падумаў бы мой чытач, пачуўшы ад экскурсавода інфармацыю пра цукеркі, а я адразу ўспомніла эпізод з кнігі «Пані Эліза» польскай пісьменніцы Габрыэлы Паўшэр-Кляноўскай, дзе гэта апісваецца. Між іншым, і сама пані Эліза, як сказала нам экскурсавод, «бывала тут сто разоў». Толькі падлога цяпер не тая, па якой ступалі яе вечна сточаныя абцасікі: раней тут ляжала італьянская кафля, а цяпер паркет. Але на сценах у рамках пад шклом вісяць арыгінальныя гербарыі пані Элізы.

Яшчэ больш цікавай падаецца інфармацыя пра тое, што ў гэтай аптэцы (як, зрэшты, і ў іншых) адпускалі некалі тытунь, прычым для выкарыстання ў лячэбных мэтах. Пасля, канешне, гэта было забаронена. Можа, пані Эліза, якая, не сакрэт, курыла без меры, і тытунь сабе тут купляла?

Паслядоўнікам



Злева ляжыць прыстасаванне для вырабу пілюль, справа — прэс для коркаў.

Асветніцкая місія любога музея — гэта не нешта глабальнае, а мноства самай рознай драбязы, якая разам важыць больш, чым што заўгодна глабальнае. Вось дзе б вы яшчэ даведаліся, як выраблялі пілюлі? Шмат хто ўвогуле ўпэўнены: пілюлі — гэта тое, што і таблеткі, проста даўнейшая назва. На самай справе таблетка — гэта моцна сціснуты пад прэсам парашок, а пілюля — штосьці зусім прынцыпова іншае. Пілюлі выраблялі пры дапамозе спецыяльных інструментаў, якія тут дэманструюць, расказваючы тэхналогію: спачатку лякарствы расціраліся ў ступцы ў драбнюткі парашок, потым змешваліся з пілюльнай асновай, у якую маглі ўваходзіць густыя экстракты каранёў лекавых раслін, мука, крухмал, цукар і белая гліна, далей маса наразалася спецыяльным прыстасаваннем на тоненькія палоскі, якія ўжо іншым спецыяльным прыстасаваннем скачваліся ў шарыкі ідэальна аднолькавага памеру. Адпаведна, і дозы лякарства былі дакладныя. Пілюлі захоўваліся ў закаркаваных шклянках. Дарэчы, прыстасаванні для іх каркавання таксама тут можна ўбачыць.

Далёка і блізка

Фестываль «О, да! Еда!» пройдзе ў Санкт-Пецярбургу **12—22 ліпеня** і ў Маскве **28—29 ліпеня.** Тыя, хто на яго патрапіць, могуць, пабыўшы і на нашых, беларускіх святах ежы, параўнаць адны з другімі і па атрыманых уражаннях скласці ўяўленне, а гэта заўсёды не менш карысна, чым смачна паесці. Фестываль «О, да! Еда!» недарэмна вандруе з горада ў горад — у кожным новым месцы ён прадстаўляе новыя кулінарныя традыцыі, без паўтораў. Удзел у ім — гэта не проста магчымасць пакаштаваць і гэта, і тое, а рэальны шанц зразумець, што не толькі гатаванне ежы з'яўляецца відам мастацтва, але і яе ўжыванне. Смачна вам есці!

Фестываль Fringe — самае вялікае свята мастацтва ў свеце — пачынаецца **3 жніўня** ў Эдынбургу. Перад вамі разыграюцца камедыі і драмы, вы будзеце мець магчымасць трапіць хоць у цырк, хоць у оперу — на свой густ, бо за час фестывалю — тры тыдні — будзе прадэманстравана некалькі дзясяткаў тысяч найразнастайнейшых шоу. Ды і сам Эдынбург — горад-шоу. Ці ведалі вы, што там ёсць музіфікаваная падземная вуліца XVII стагоддзя? Шукайце тупік Мэры Кінг.

4 жніўня ў Маскоўскай вобласці, Арэхава-Зуеўскім раёне, горадзе Лікіна-Дулёва (ад Масквы — 80 км) пройдзе фестываль «Вар-Варэнне». Фестываляў варэння ў Расіі ладзіцца шмат, і кожны варты таго, каб у ім паўдзельнічаць, калі не з варэннем, дык хоць бы з лыжкай. «Вар-Варэнне» — свята для дружных сем'яў, якія любяць салодкія ўражанні.

21—22 ліпеня — зноўку «Наш Грунвальд». Ці вы гэтым разам гатовыя? Застаецца трошкі часу, каб: а) начысціць даспехі да бляску; б) навучыцца танцаваць як даўней; в) набыць адпаведнае адзенне; г) вывучыць «Слаўлю адвагу, ваяроў сармацкіх, што пасеклі ў бітве рыцараў крыжацкіх»; д) перачытаць «Крыжакоў». Ці паспееце?

«Гараднянскі кірмаш» — гэта падзея для тых, хто любіць, шануючы традыцыі і памяць бабуль, карыстацца гарлачыкамі і збанкамі і ведае паміж імі розніцу. У вёсцы Гарадная ў Столінскім раёне існуе адзіная цяпер у Беларусі школа ганчароў, а раней у Гарадной, бадай, адны ганчары і жылі. Шосты па ліку, міжнародны па статусе пленэр ганчароў суправаджаецца выстаўкай-кірмашом, але — увага! — не ў Гарадной, а ў Століне, **23 ліпеня.** Дарэчы, без дэгустацый і там не абыдзецца.

11 жніўня на Аўгустоўскім канале — Свята мора. Сапраўднае, з Нептунам і... Мабыць, русалкі таксама прадугледжаны. Там пабачыце. Самая цікавая забава з тых, што рыхтуюцца, — гонкі «На чым папала». А 27 жніўня на Аўгустоўскі канал можна вярнуцца — там пройдзе фестываль народнай творчасці, дзе будуць прадстаўлены і рамёствы, і — зноў! — пачастункі.

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ
Закрытое акционерное общество

Наименование банка:

ЗАО «ТК Банк»

www.tcbank.by

Консолидированный отчет о финансовом положении

	31 декабря 2017 года	31 декабря 2016 года
АКТИВЫ		
Денежные средства и их эквиваленты	61 488	56 353
Средства в финансовых организациях	36 754	-
Кредиты клиентам	3 380	19 662
Финансовые активы, имеющиеся в наличии для продажи	80 026	304 946
Инвестиционная собственность	29 452	29 857
Основные средства и нематериальные активы	17 491	17 341
Актив по отложенному налогу на прибыль	4 113	-
Прочие активы	22 740	15 319
ИТОГО АКТИВЫ	**255 444**	**443 478**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ		
Обязательства		
Средства финансовых организаций	91 739	288 086
Средства клиентов	3 419	3 032
Обязательства по текущему налогу на прибыль	1 640	1 106
Обязательства по отложенному налогу на прибыль	-	1 403
Прочие обязательства	2 545	117
Итого обязательства	**99 343**	**293 744**
Капитал		
Уставный капитал	188 975	188 975
Эмиссионный доход	61	61
Фонд переоценки финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	(6 383)	(17)
Накопленный убыток	(26 552)	(39 285)
Итого капитал	**156 101**	**149 734**
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ	**255 444**	**443 478**

Консолидированный отчет о совокупном доходе

	2017 год	2016 год
Процентные доходы	23 116	55 066
Процентные расходы	(7 022)	(11 163)
Чистые процентные доходы	**16 094**	**43 903**
Комиссионные доходы	493	134
Комиссионные расходы	(114)	(81)
Чистые комиссионные доходы	**379**	**53**
Чистые доходы/(расходы) по операциям с иностранной валютой	272	(1 086)
Чистые (расходы)/доходы по финансовым активам, имеющимся в наличии для продажи	(631)	240
Чистые прочие доходы	4 343	5 705
Итого операционные доходы	**20 457**	**48 815**
Чистое изменение резервов под обесценение финансовых активов	7 001	28 486
Чистое изменение резервов на риски и платежи	(2 308)	-
Чистые изменения резерва под обесценение по прочим активам	(1 498)	-
Операционные расходы	(9 116)	(37 117)
Прибыль до налогообложения	**14 536**	**40 184**
Расходы по налогу на прибыль	(1 803)	(4 859)
Прибыль за год	**12 733**	**35 325**
Прочий совокупный доход		
Статьи, которые могут быть переклассифицированы в прибыли или убытки:		
Чистое изменение справедливой стоимости финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	(9 073)	299
Чистый результат, перенесенный в прибыль или убыток по финансовым активам, имеющимся в наличии для продажи	585	(743)
Отложенное налоговое обязательство	2 122	111
Итого прочий совокупный доход, который может быть переклассифицирован в прибыли или убытки	**(6 366)**	**(333)**
Итого совокупная прибыль за отчетный год	**6 367**	**34 992**

Консолидированный отчет об изменениях в капитале

	Примечание	Уставный капитал	Эмиссионный доход	Фонд переоценки финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	Накопленный убыток	Итого капитал
Остаток на 31 декабря 2015 года		**188 975**	**61**	**316**	**(72 310)**	**117 042**
Общая совокупная прибыль/ (убыток)		**-**	**-**	**(333)**	**35 325**	**34 992**
Чистая прибыль/(убыток) за год		-	-	(444)	35 325	34 881
Отложенный налог		-	-	111	-	111
Операции с собственниками, отражаемые напрямую в капитале		**-**	**-**	**-**	**(2 300)**	**(2 300)**
Дивиденды объявленные	16	-	-	-	(2 300)	(2 300)
Остаток на 31 декабря 2016 года		**188 975**	**61**	**(17)**	**(39 285)**	**149 734**
Общая совокупная прибыль/ (убыток)		**-**	**-**	**(6 366)**	**12 733**	**6 367**
Чистая прибыль/(убыток) за год		-	-	(8 488)	12 733	4 245
Отложенный налог		-	-	2 122	-	2 122
Остаток на 31 декабря 2017 года		**188 975**	**61**	**(6 383)**	**(26 552)**	**156 101**

Консолидированный отчет о движении денежных средств

	Примечание	2017 год	2016 год
Денежные потоки от операционной деятельности:			
Полученные процентные доходы		20 178	33 905
Уплаченные процентные доходы		(8 413)	(11 325)
Полученные комиссионные доходы		494	135
Уплаченные комиссионные доходы		(113)	(80)
Реализованный результат по операциям с иностранной валютой		297	(305)
Реализованный результат по операциям с финансовыми активами, имеющимися в наличии для продажи		(631)	240
Прочие полученные доходы		17 122	5 705
Прочие уплаченные расходы		(7 690)	(37 355)
Уплаченный налог на прибыль		(3 966)	(13 934)
Движение денежных средств, полученных от операционной деятельности, до изменений в операционных активах и обязательствах		**17 278**	**(23 014)**
Увеличение/(уменьшение) операционных активов:			
Средства в финансовых организациях		(37 427)	31 465
Кредиты клиентам		60	18 166
Финансовые активы, имеющиеся в наличии для продажи		255 474	(31 365)
Прочие операционные активы		4 083	2 587
Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств:			
Средства финансовых организаций		(231 266)	(1 202)
Средства клиентов		(110)	1 909
Прочие операционные обязательства		(5 070)	(230)
Чистое движение денежных средств от операционной деятельности		**3 022**	**(1 684)**
Денежные потоки от инвестиционной деятельности:			
Приобретение основных средств и нематериальных активов		(456)	(238)
Продажа основных средств и нематериальных активов		1	2
Чистое движение денежных средств от инвестиционной деятельности		**(455)**	**(236)**
Денежные потоки от финансовой деятельности: Выплата дивидендов		-	(2 205)
Чистое движение денежных средств от финансовой деятельности		**-**	**(2 205)**
Чистое увеличение/(уменьшение) денежных средств и их эквивалентов		**2 567**	**(4 125)**
Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты		2 568	(550)
Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года	**5**	**56 353**	**61 028**
Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года	**5**	**61 488**	**56 353**

Председатель Правления С.Ф. Хайновский

Главный бухгалтер Н.А. Тиванова

г. Минск,
15 июня 2018 года

BDO

Тел.: +375 17 308 74 50
Факс: +375 17 308 74 51
www.bdo.by

ООО «БДО»
пр-т Победителей, 103,
этаж 8, помещение 7
Минск, Беларусь
220020

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО КОНСОЛИДИРОВАННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Акционерам, Совету Директоров, Аудиторскому комитету
Правлению Закрытого акционерного общества «Банк Торговый капитал»,
Национальному банку Республики Беларусь
Исх. № 04-05/49
Дата: 15.06.2018

Аудиторское мнение

Реквизиты аудируемого лица:
Наименование: Закрытое акционерное общество «Банк Торговый капитал»
(сокращенное наименование банка – ЗАО «ТК Банк»)
Место нахождения: Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А;
Сведения о государственной регистрации: закрытое акционерное общество «Банк Торговый капитал» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 12 сентября 2008 года, регистрационный № 807000163
УНП: 807000002

Мы провели аудит консолидированной финансовой отчетности ЗАО «ТК Банк» (далее – «Группа»), состоящей из:
Консолидированного отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2017 года;
Консолидированного отчета о совокупном доходе, консолидированных отчетов об изменении собственного капитала и движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату; а также
Примечаний к консолидированной финансовой отчетности, включающих краткое изложение основных положений учетной политики.
По нашему мнению, прилагаемая консолидированная финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах консолидированное финансовое положение ЗАО «ТК Банк» по состоянию на 31 декабря 2017 года, а также его консолидированные финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (далее – «МСФО»).

Основание для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита (далее – «МСА»). Наши обязанности, предусмотренные указанными стандартами, более подробно рассматриваются в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита консолидированной финансовой отчетности» настоящего заключения.
Мы являемся независимыми по отношению к ЗАО «ТК Банк» в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров, опубликованным Комитетом по международным этическим стандартам для бухгалтеров, и выполнили наши иные этические обязанности в соответствии с требованиями данного Кодекса.
